ралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, połączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
29 чэрвеня 1931 г.
№ 147 (3236)

Дзяржаўная бібліятэка БССР

ЗА УЛІК ПРАЦЫ, ЗА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ У КАЛГАСАХ!

Сёньня—пяты дзень праверкі ўліку працы ў калгасах. Падагульваць вынікі яшчэ вельмі рана, але адно бясспрэчна і відавочна: пяцідзёньнік разгарнуўся ў Савецкай Беларусі як сапраўды масавая палітычная кампанія, накіраваная на ўзмацненьне існуючых калгасаў, на арганізацыю новага калгаснага прыліву, на ўдарную падрыхтоўку ўборачных работ.

Пяцідзёньнік выклікаў ўздым энтузіязму і актыўнасьці ў масах калгаснага сялянства, прычым партыйныя арганізацыі ў асноўным справіліся з задачай узгалавіць гэты новы ўздым. Па данамогу калгасам усе раённыя арганізацыі паслалі значную колькасьць адказных работнікаў, здолелі прыцягнуць да гэтай справы шырокія пласты савецкага актыву, вясковага насельніцтва, рахункавых работнікаў... Значэньне пяцідзёньніка ўзьнята на вялікую палітычную прынцыповую вышыню.

Глыбока прасякнула ў сьвядомасьць шырокіх мас калгасьнікаў думка аб тым, што бяз уліку немагчыма буйная калектыўная гаспадарка, што «ўлік, гэта—сацыялізм», (Ленін), што бяз уліку немагчыма арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Калгаснае сялянства на вопыце вес навой пасеўнай кампаніі мела магчымасьці глыбока пераканацца, што правільна зразуметая і праведзеная зьдзельшчына ў многіх мясцох адыграла вялізарнейшую ролю ў сэнсе замацаваньня існуючых калгасаў і далейшага ўздыму калгаснага руху.

З другога боку, калгаснае сялянства на тым-жа вопыце другой бальшавіцкай вясны выразна бачыла, што ва ўсіх выпадках няправільнай пастаноўкі, або адсутнасьці ўліку працадзён зьдзельшчына фантычна зводзіцца на нішто.

Шырачэзныя масы калгасьнікаў зразумелі, што бяз зьдзельшчыны немагчыма калектыўная гаспадарка, а бяз уліку няма зьдзельшчыны. Адначасова калгасьнікі на вопыце досьць яскрава бачылі, што скажэньне ва ўліку працы—на руку кулаком і падкулачнікам, лодырам і гультаям.

У гэтых адносінах выключную ролю адыгрывае пяцідзёньнік, у які ідэя правядзеньня зьдзельшчыны і чоткага ўліку працадзён шырока папулярызуецца, у які ўвага мільёнаў прыкоўваецца іменна да канкрэтнага ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны.

Пяцідзёньнік моцна разварушыў цэнтральныя, раённыя і нізавыя калгасныя органы, прымусіў іх грунтоўна падпягнуцца, падвысіць тэмпы сваёй работы. Працоўная кніжка зрабілася надзвычайна папулярнай сярод калгасьнікаў. Зараз масы калгасьнікаў самі настойліва патрабуюць раздачы працоўных кніжак на-рукі. Гэты—канкрэтны, станоўчы посьпех першых дзён пяцідзеньніка.

Другім посьпехам, дасягнутым за першыя дні пяцідзёньніка, зьяўляецца пачаўшаяся масавая праверка правільнасьці запісу працадзён у табэлях і запаўненьне працкніжок запісамі аб якасных і колькасных працоўных затратах кожнага калгасьніка ў часе сяўбы і праполкі.

Праўда, мы ў гэтых адносінах толькі разгортваем работу, посьпехі пакуль-што не вялікія, але масы ўжо ўзьняты, але да пытаньняў уліку ўвага мас ужо прыкавана—і ў гэтым запорука посьпеху. Досьць падаць такі факт, як мабілізацыя ў адным толькі Койданаўскім раёне больш 1.000 чалавек на гэту работу, каб навочна ўявіць сабе маштабы разгарнуўшайся кампаніі.

На агульным фоне масавага ўздыму і сапраўды баявой работы па наладжваньні уліку працы ў калгасах БССР асабліва ганебным зьяўляецца сур'ёзнае адставаньне паасобных раёнаў. Так, брыгада нашай газэты паведамляе з Бабруйску аб тым, што ўлік выпрацоўкі ў калгасах раёну праводзіцца дрэнна, што ўліку якасьці працы няма, што працоўныя кніжкі калгасьнікам ня выданы, што пяцідзёньнік уліку праходзіць самацёкам. Яшчэ горш у Магілёўскім раёне. Тут працоўныя кніжкі да апошніх дзён ляжалі на складах і ня былі разданы калгасьнікам. Мы ня можам кваліфікаваць гэты факт інакш, як яўную спробу сарваць арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгаснага руху. Бабруйскі і Магілёўскі раёны павінны напружыць усе сілы, каб падцягнуцца да ўзроўню перадавых раёнаў, якія напазваюць узоры барацьбы за ўлік працы ў калгасах, за ўвядзеньне зьдзельшчыны ў ва ўсіх без выключэньня калгасах.

Пяцідзёньнік—толькі пачатак рэгулярнага ўліку працы ў калгасах. Атрымаўшы намі ў пяцідзёньнік посьпехі трэба замацаваць. Трэба дамагчыся, каб запісы ў працоўную кніжку праводзіліся не радзей аднаго разу ў пяцідзёньнік, а запіс у табэлі брыгадзіра—кожны дзень. Прычым уся справа ўліку павінна быць арганізавана іменна як гаспадарча-палітычнае мерапрыемства, а ня як вузка-тэхнічная справа.

Наладзіць у калгасах просты і ў той-жа час вельмі дакладны і чоткі ўлік—баявое заданьне партыі і ўраду.

Вось чаму пытаньні ўліку павінны стаць у цэнтры штодзённай увагі калгасных партячэек, сельпарткомаў, райпарткомаў, саветаў. Надзвычайна актуальным зьяўляецца гэтае патрабаваньне сёньня, бо трэба зразумець, што дрэнны ўлік, або адсутнасьць уліку працадзён—непасрэдная пагроза ўборцы.

Разам з тым з усёй сілай неабходна падкрэсьліць таксама і наступнае: да гэтага часу зусім нездавальняюча выконваецца адна з важных задач пяцідзёньніка — арганізаваць показ узорнай пастаноўкі ўліку працы ў калгасах.

Пяцідзёньнік праверкі ўліку працы ў калгасах закончваецца, але барацьба за дакладны і чоткі ўлік павінна працягвацца, ні на хвіліну не паслабляючыся. Барацьба за ўлік працы ў калгасах ёсьць барацьба супроць кулака, за новы ўздым калгаснай хвалі, ёсьць барацьба за ўдарнае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Пяты дзень пяцідзёньніка вучоту працы ў калгасах

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА І ПРАВІЛЬНЫ ВУЧОТ ПРАЦЫ

ЗАБЯСЬПЕЧАЦЬ УДАРНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

„... Забясьпечыць ва ўсіх без выключэньня калгасах да пачатку ўборкі сканчэньне падліку працадзён, выпрацаваных кожным калгасьнікам за час пасеўнай і праполачнай кампаніі"

(З рэзалюцыі чэрв. пленуму ЦК УсеК(б)

У самы кароткі тэрмін выдаць усім калгасьнікам працоўныя кніжкі і пачаць рэгулярны запіс працадзён

Працоўныя кніжкі ляжаць на складах

Барысаўскі РВК тармозіць правядзеньне пяцідзёньніка

Барысаў. (Наш. спэцкор). Да правядзеньня пяцідзёньніка вучоту працы ў калгасах, Райкалгассаюз зусім нічога не зрабіў. З боку Райкалгассаюзу была праўлена поўная бязьдзейнасьць да пытаньня насылкі брыгад друку. Пасланых работнікаў для вучоту працы ў калгасы Райкалгассаюз вярнуў назад праз дзень.

З працоўнымі кніжкамі вельмі дрэнна. Палова калгасаў ня мае ніводнай працоўнай кніжкі, у той час калі на складах Райкалгассаюзу некалькі тысяч працоўных кніжак ляжаць каля двух тыдняў нярухомымі. Райкалгассаюз ня прымае захадаў, каб іх выкупіць і паслаць у калгасы толькі таму, што ў яго «няма ні воднага рубля грошай». Між тым аб'ем выкупіць гэтыя кніжкі трэба 20—25 руб. Грошы ў Райкалгассаюзе былі і ёсьць, але справа ня ў грошах, а ў злачынай нядбайнасьці праўленьня Райкалгассаюзу. Нават пры адсьлдзе на раён ударных брыгад друку іх не забясьпечылі кніжкамі, па вельмі «уважлівай» прычыне—быў выходны дзень і склады былі зачынены. У выніку гэтага можа сарвацца пяцідзёньнік.

РВК у асобе тав. Шапіра таксама не зрабіў ніякіх захадаў, каб пяцідзёньнік правесьці па-баявому. Райпрафсавет пастанавіў, каб з кожнай установы па магчымасьці выслаць па адным рахункаводзе, але Шапіра запрапанаваў Райпрафсавету не рабіць адміністрацыйнага націску, а правесьці гэта па згодзе з гаспадарнікамі. Корсік.

Брыгадзір запісвае працадні. Калгас «Энгельса» Уваравіцкага раёну.

Жлобінскі РКС не сьпяшаецца праверыць вучот

Жлобін. (Наш. кар.). Жлобінскі раён ня ўключыўся ў пяцідзёньнік праверкі ўкараненьня зьдзельшчыны ў калгасах і наладжваньня вучоту працы.

Між тым, са зьдзельшчынай у калгасах Жлобінскага раёну справа абстаіць нездавальняюча. Па некаторых калгасах зьдзельшчына існуе толькі на паперы.

Ня гледзячы на дрэннае становішча з увядзеньнем зьдзельшчыны і вучотам працы, Райкалгассаюз не сьпяшаецца зрабіць праверку. Старшыня Райкалгассаюзу Калесьнікаў мяркуе заняцца вучотам працы на калгасах пасьля 1-га ліпеня, а канкрэтна, калі, ён і сам ня ведае.

Райком ЛКСМБ уключыўся ў пяцідзёньнік, але брыгад яшчэ ня выслаў. Толькі 27 чэрвеня мелася вылучыць 44 камсамольцаў, для правядзеньня праверкі.

26 чэрвеня выехала праводзіць праверку становішча вучоту і самой зьдзельшчыны брыгада чырвонаармейцаў у ліку 5 чалавек.

Ямс.

Дапамагчы калгасу „Чырвоны Партызан" арганізаваць працу і вучот яе

Вопыт леташняга вучоту ў калгасе «Чырвоны Партызан», Бортнікаўскага сельсавету, Бабруйскага раёну, яскрава паказаў да чаго даводзіць адсутнасьць вучоту і чоткай арганізацыі працы. Увесь вучот і ўся канцылярыя калгасу знаходзіліся ў кішэні старшыні мінулага складу праўленьня калгасу. У выніку ўсяго гэтага пры разьмеркаваньні ўраджаю невядома было колькі хто працаваў дзён, наколькі кожны з калгасьнікаў павінен удзельнічаць у прыбытках калгасу.

Вынікі гэткага вучоту адчуваюцца ў калгасе і на сёньняшні дзень. Старыя справы калгасу ляжаць і за іх ніхто не адважваецца ўзяцца. Рахункаводзтва надзвычайна заблытана. Новы рахунка вод пачаў усё спачатку і за работу мінулых рахункаводаў адказваць ня хоча.

Замест практычнай дапамогі ў арганізацыі працы і вучоту, райкалгассаюз засылае праўленьне калгасу жмутамі паперак. Перавод на зьдзельшчыну прайшоў бяз удзелу і дапамогі райкалгассаюзу. Праўда, прыяжджаў прадстаўнік яго, але пабыў у калгасе вельмі кароткі час, мала даў практычнага для работы калгасу сваім прыездам і больш калгас ні інструктара ні членаў праўленьня калгассаюзу ня бачыў.

Такая гастралёрская дапамога мае ў выніку тое, што пастаноўка працы і ўвядзеньне зьдзельшчыны ў калгасе на сёньняшні дзень мае шмат хібаў. На рабоце ў гародзе да апошняга часу ня была ўведзена зьдзельшчына. Брыгады калгасьнікаў створаны, але брыгадная праца зусім абязьлічана. Сёньня ў брыгадзе працуюць адны калгасьнікі,—заўтра другія, пазаўтра—трэція. Гэтае перакідваньне з брыгады ў брыгаду ўскладняе вучот працы, ускладняецца і сама расстаноўка сіл і сродкаў. Часта такая арганізацыя брыгад выклікае спрэчкі паміж самымі брыгадамі.

Удзельнікі брыгад не замацаваны за брыгадамі і брыгадзірамі, наглядаецца перацягваньне людзей з аднае брыгады ў другую і г. д. Дрэнна пастаўлена работа і з папулярызацыяй выніку працы калгасьнікаў. Вучот выпрацоўкі вядзецца, але аб ім калгасьнік ня ведае. Падлік выпрацоўкі за час веснавой пасеўнай кампаніі ня скончаны. Працоўныя кніжкі да гэтага часу калгасьнікам ня выданы, яшчэ ня скончаны запісы ў іх за мінулы час.

Раздача дзённых нарадаў на працу ў калгасе і на сёньняшні дзень зьяўляецца балючым і неразумелым пытаньнем. Спрабавалі гэта рабіць, але нічога ня выйшла. Паводле нараду, вы значалася адна работа, а на справе рабілася другая. Такім чынам, дача нарадаў зрывалася. З боку праўленьня няма належнай увагі да гэтай работы, няма імкненьня наладзіць чоткую плянавую работу па заданьнях. А між тым, плянавасьць палепшыла-б вучот самае працы і арганізацыю яе.

Вучоту працы па якасьці зусім не праводзіцца. У праўленьні існуе думка, што гэтага зусім нельга зрабіць ва ўмовах калгасу. Выпрацоўка брыгад разьмяркоўваецца паміж удзельнікамі ў парадку ўраўнілаўкі, шляхам простага падзелу выпрацоўкі на лік людзей.

Да гэтага часу ня ўведзена зьдзельшчына па цясьлярскай рабоце і ў догляд дзе за жывёлай. Не ўстаноўлены цьвёрдыя нормы выпрацоўкі ў гародзе.

Наглядаецца значная блытаніна ў вучоце часовых работ. Часам згадчык гаспадаркі не заносіць у табэлі ўсіх калгасьнікаў, якія працавалі.

Усе гэтыя недахопы адбіваюцца на ўнутраным жыцьці і працы калгасу. Калгасу павінна быць аказана дапамога ў наладжваньні запушчанага рахункаводзтва і ў лепшай арганізацыі працы і вучоту яе. Райкалгассаюз, які да гэтага часу зусім не зварочваў увагі на калгас павінен паставіць наладжваньне працы і вучот яе ў цэнтр увагі. Зараз-жа патрэбна пакончыць з абязьлічкаю ў брыгадах, увесьці зьдзельшчыну ва ўсіх галінах працы. У самы кароткі тэрмін павінны быць выданы калгасьнікам працоўныя кніжкі і наладжаны самы дасканалы штодзённы запіс выпрацоўкі калгасьнікаў.

У пяцідзёньнік праверкі раённыя арганізацыі павінны дапамагчы наладзіць арганізацыю і вучот працы ў калгасе «Чырвоны Партызан», мабілізаваўшы на гэта шырокія працоўныя масы.

Брыгада газэт «Сав. Бел.» і «Камуніст»
Данейка Куліна, Кот Арцём, Дуброўскі А. Мышкавец Г., Шуцік Я. Трасун Х., Дайнека Д., Хурсан Д., Кот Адар'я, Дайнека В., Скудны П.

Дрэнная пастаноўка вучоту працы зрывае працдысцыпліну

Калгас імя Сталіна павінен зьнішчыць усе недахопы

У калгасе імя Сталіна, Траскоўскага сельсавету, Заслаўскага раёну, вучот працы наладжаны вельмі дрэнна. Брыгадзіры ўсіх брыгад да гэтага часу ня ведаюць новых форм вучоту працы калгасьнікаў, а праўленьне калгасу не зварачвае ніякай увагі на зьнішчэньне гэтых недахопаў. Быў выпадак, калі калгасьнікі з брыгады «Краснае» прышлі да брыгадзіра Малькоўскага паглядзець, колькі выпрацавана працадзён, але апошні не паказаў ім табэля, бо ён сам добра ня ведаў гэтага вучоту. Ні ў аднэй брыгадзе няма насьценных нарадаў для вучоту працы калгасьнікаў.

Да гэтага часу не разгорнута сацыяборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, ня гледзячы на тое, што ўмовы былі заключаны. Праўленьне не правярае, як выконваюць работы калгасьнікі, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Калгасьнікі, якія сапраўды зьяўляліся ўдарнікамі, не прэміяваліся, ня гледзячы на тое, што быў вызначаны спэцыяльны фонд на гэтую мэту.

Рабочыя пляны па ўборцы ўраджаю яшчэ ня складзены, работа па ўборцы сена тармазіцца, было шмат прагулаў у часе работы. Напрыклад, у брыгадзе «Іскочна» зрабіў 3-дзённы прагул калгасьнік Я. Варывоцкі, які езьдзіў у Менск па сваіх справах, але праўлень не калгасу аб гэтым нічога ня ведала.

Праўленьне калгасу павінна заразжа зьнішчыць усе недахопы, па-ударнаму пераключыцца на правядзеньне ўборачнай кампаніі, поўнасьцю перайсьці на зьдзельшчыну і належна арганізаваць вучот працы ў калгасе.

Брыгада газ. «Сав. Бел.». Лях,
Мядзьведзяў Н. Г.

10 чэрвеня ўсебеларускі зьезд рабселькораў

ЗМАГАЦЦА ЗА ПОЎНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ

ПА ПЫТАНЬНІ ПЕРАБУДОВЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

З усёй рашучасьцю біць па праваапартуністычных паклёпах Пыжыкавых на пралетарскі друк і рабселькораў

Абгаварэньне тэзісаў да зьезду—пусьціць на поўны ход

Калгас „Камінтэрн" абгаварыў тэзісы і аб'вясьціў сябе ўдарным

Магілеў (наш. кар.). З вялізарным уздымам актыўнасьці прайшло абгаварэньне тэзісаў па жывёлагадоўлі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў у калгасе «Камінтэрн» Слабодзкага сельсавету.

Выступаючыя ў спрэчках калгасьнікі ўсе свае прамовы сканцэнтравалі на мабілізацыю мас па ўкамплектаваньні жывёлагадоўчых гаспадарак як сьвіньнямі ,так і каровамі.

Калгасьнікі ўзялі на сабе абавязак: У ажыцьцяўленьне лёзунгу «кожны рабселькор—ударнік, кожны ударнік—рабселькор» арганізавана дзьве ўдарныя селькораўскія брыгады з 10 чал., якія абавязаліся да сканчэньня зьезду рабселькораў уцягнуць у шэрагі рабселькораў ня менш 50 проц. лепшых ударнікаў.

Пачынаючы з 26 чэрвеня стала на час падрыхтоўчай работы да ўборачнай і правядзеньня ўборачнай выпушчаць на менш два разы ў тыдзень насьценгазэту, напаўняючы яе штодня новым сьвежым матар'ялам, а таксама кожны дзень выпушчаць вусную газэту на полі, як у час перапынку так і ў час абедзенага перапынку паасобных брыгад, асьвятляючы ў ёй увесь ход работы па ўборцы.

У сувязі з тым, што калгас мае сьвінагадоўчы ўхіл, а кваліфікаваных кадраў у калгасе няма, арганізаваць у першую чаргу ў бліжэйшыя дні гурток па сьвінагадоўлі для вывучэньня тэхнікі і на вопыце гэтага гуртка ў бліжэйшы час арганізаваць такія-ж гурткі па ўсіх галінах работ, дабіваючыся поўнага ахопу гурткамі калгасьнікаў.

Ажыцьцяўляючы задачы партыі і ўраду аб арганізацыі моцнай кармавой базы калгасьнікі абавязаліся на заліўных лугох зрабіць два ўкосы, і плян сілаваньня на сустрэчным павялічыць на 100 проц. (плян 40 тон, калгасьнікі абавязаліся засілаваць 80 тон).

На час уборачнай кампаніі, калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і абавязаліся ўборку скончыць на 10 дзён раней тэрміну.

У сувязі з тым, што Слабодзкі сельсавет адстае ад тэмпаў калектывізацыі (процант калектывізацыі па сельсавету дасягае ўсяго 15), разгарнуць штодзенную масавую работу па ўцягненьні бядняцка - серадняцкіх гаспадарак у калгасы, дабіваючыся поўнага ажыцьцяўленьня пастаўленых задач раённых партыйных і савецкіх арганізацый аб калектывізацыі ня менш 35 проц. да часу ўборачнай кампаніі.

Селькоры ўдарнікі абяцаюць праз шырокую крытыку і самакрытыку па ўсім фронце забясьпечыць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, пасьпяхова правесьці ўборачную кампанію, даць сакрушальны ўдар кулацтву.

А. Сяньковіч.

Усім ЦП прафсаюзаў, райпрафсаветам і старшыням фабзаўмясцкомаў

Праведзены гэтамі днямі органамі кантрольных камісій і рэдактарамі газэт Усебеларускі рэйд праверкі падрыхтаванасьці да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў выявіў недапушчальна нездавальняючы ўдзел у падрыхтоўцы да зьезду з боку асобных ЦП прафсаюзаў і раду фабзаўмясцкомаў.

Надаючы важнае палітычнае значэньне рабоце па падрыхтоўцы і правядзеньню ўсебеларускага зьезду рабселькораў Цэнтральны Савет прафэсыянальных саюзаў БССР абавязвае:

а) Усе ЦП прафсаюзаў, фабзаўмясцкомаў і прафпаўнаважаныя павінны скарыстаць застаўшыяся да зьезду 12 дзён (зьезд адкрываецца 10-га ліпеня) для разгортваньня масавай дзелавой работы па абгаварэньні праектаў тэзісаў сэкцый Ўсебеларускага зьезду рабселькораў;

б) пастанова ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка аб перабудове рабселькораўскага руху і праекты тэзісаў сэкцыі павінны абгаворвацца на сходах рабочых па асобных спэцыяльнасьцях (сходы рабочых такароў, сходы рабочых—ліцейшчыкаў і г. д.) з прыцягненьнем гаспадарнікаў, спэцыялістых і гэтак далей;

в) на чарговых паседжаньнях Прэзыдыўмаў ЦП прафсаюзаў абгаварваць з удзелам прафсаюзнага актыву, праекты тэзісаў;

г) забясьпечыць безадкладную пасылку ўсіх прыманых да тэзісаў дадаткаў у рэдакцыі адпаведных газэт (па мэталі ў рэдакцыю газэты «Зьвяз да», па торфе—«Чырвоная Зьмена», па чыгуначна-водным транспорце і скурана-абутковай прамысловасьці ў рэдакцыю газэты «Рабочий», па тэкстыльна швэйнай — газэта «Акцябр», па канцэрацыі газэта «Савецкая Беларусь», па дрэваапрацоўчай прамысловасьці газэта «Рабселькор», па лёне—газэта «Калгасьнік Беларусі», па жывёлагадоўлі—«Калгасьнік Беларусі», па МТС—газэта «Сельска-гаспадарчы Рабочы Беларусі»).

Усю работу па падрыхтоўцы Ўсебеларускага зьезду рабселькораў трэба арганічна зьвязаць з узмацненьнем існуючых шматтыражак і насьценгазэт і стварэньнем насьценных газэт у кожнай брыгаде, забясьпечваючы мак смальнае пачашчэньне выхаду газэт. ЦСПСБ абавязвае Гарпрафсаветы і Райпрафбюро заслухаць на паседжаньнях Прэзыдыўму ў выбарачным парадку даклады некалькіх фабзаўкомаў і мясцкомаў аб падрыхтоўкі да надыходзячага Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Старшыня Цэнтральнага савету Беларусі. Рыжоў.

Друк і рабселькоры

ў разуменьні правага апартуніста т. Пыжыкава

27 чэрвеня скончыла работу міжраённая нарада старшынь Райсаюзаў спажывецкай кааперацыі і старшынь райпрэсцкомаў прафсаюзу работнікаў спажывецкай кааперацыі і гандлю. На нарадзе былі заслуханы, поруч з дакладамі аб перабудове спажывецкай кааперацыі і перабудове прафсаюзнай работы, даклад аб ролі рабселькораў у перабудове спажывецкай кааперацыі наогул і падрыхтоўцы да Ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду ў прыватнасьці. Па апошнім дакладзе выступіла ў спрэчках каля 10 таварышоў. З ходу спрэчак выявілася, што на лініі спажывецкай сыстэмы падрыхтоўка да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў не разгорнута і да распрацоўкі тэзісаў па спажывецкай кааперацыі не прыступлена.

Не абыйшлося і бяз праваапартуністычных разважаньняў аб ролі нізавога друку і рабселькораўскага руху. З праваапартуністычнай тэорыяй выступіў прадстаўнік Глускага раёну таз. Пыжык. Ён у сваёй прамове гаварыў: «раённыя газэты нам зусім не дапамагаюць у рабоце, насьцен газэты бяруць пад сваю абарону лятуноў, прагульшчыкаў, рабселькоры робяць ганеньні на кааператараў, рабселькоры працуюць не для дапамогі кааперацыі, а за ганарар».

Нарада дала рашучы адпор гэтаму праваапартуністычнаму выступленьню т. Пыжыка і яго поглядам на нізавы друк і на рабселькораў.

Нарада адзначыла, што работа па разгортваньні рабселькораўскага руху сыстэмай спажывецкай кааперацыі не праводзіцца, што не аказваецца да памогі нізавому друку, што падрыхтоўка да рабселькораўскага Ўсебеларускага зьезду адсутнічае і што тэзісы да зьезду не распрацаваны.

Выходячы з гэтага нарада прыняла рад практычных прапаноў па ліквідацыі гэтага ганебнага прарыву ў разгортваньні масавай работы наогул, а рабселькораўскага руху ў прыватнасьці.

Парафенюк.

Усім дырэктарам аб'яднаньня і кіраўнікам саюзных аддзяленьняў

10-га ліпня пачынае сваю работу гу, з лістом да адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу аб іх удзеле ў абгаварэньні праектаў тэзісаў.

Ўсебеларускі зьезд рабселькораў. Прэзыдыум ВСНГБ надаючы значнае палітычнае значэньне надыходзячаму зьезду лічыць неабходным, каб гаспадарчыя работнікі і кіраўнікі аддзяленьняў і аб'яднаньняў БССР прынялі непасрэдны актыўны ўдзел у абгаварэньні апублікаваных у друку праектаў тэзісаў сэкцый Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

У прыватнасьці мэтазгодна, каб дырэктары гаспадарчых аб'яднаньняў і аддзяленьняў зьвярнуліся, у сваю чаргу, з лістом да адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу аб іх удзеле ў абгаварэньні праектаў тэзісаў.

Неабходна забясьпечыць безадкладную дасылку ўсіх прыманых да тэзісаў дадаткаў у рэдакцыі адпаведных газэт (па мэталёпрамысловасьці—ў рэдакцыю газэты «Зьвязда», па торфе—газэты «Чырвоная Зьмена», скурна-абутковай прамысловасьці — «Рабочий» па шклопрамысловасьці—газэты «Орка».

Нам. Старшыні ВСНГБ
Амбражунас.

Кругляншчына ня рыхтуецца да зьезду

Падрыхтоўка да Ўсебеларускага Зьезду рабселькораў на Кругляншчыне праходзіць яўна нездавальняюча.

У большасьці калгасаў раёну на сёньняшні дзень няма насьценных газэт. Нізавы друк у часе другой бальшавіцкай вясны цягнуўся ў хвасьце ўдарных тэмпаў. Некаторыя насьценгазэты ня выходзяць больш чымся 3 месяцы. Паўлавіцкая і Кругляншская ячэйкі КП(б)Б ня выканалі пастаноў арганізаваць у калгасах «Сонца» «Земля роб» насьценгазэты.

Тэзісы да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў надрукаваны ў газэтах некалькі тыдняў таму назад, але ў Кругляншкім раёне ніводная арганізацыя ніводная ячэйка КСМ, КП(б) не патурбаваліся іх распрацаваць.

Лёзунг «кожны рабселькор-ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор» застаецца невыкананым.

Трэба райкому КП(б)Б узварушыць справу падрыхтоўкі да зьезду і зажымпчыкаў самакрытыкі прыцягнуць да адказнасьці.

М. З.

Ліквідаваць прарыў па будаўніцтву сілосных вежаў

ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ НА ЗАВОДАХ

павінны дабіцца сваячасовага выпуску сілосных вежаў

АДКРЫТЫ ЛІСТ

Рабочым Бабруйскага камбінату, Менскага заводу „Дрэваапрацоўшчык", партыйным і прафсаюзным арганізацыям гэтых заводаў, адміністрацыі і тэхпэрсаналу Лесбелу

Выконваючы пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б і па становы VI Усесаюзнага зьезду Саветаў аб вырашэньні праблемы жывёлагадоўлі, памятаючы, што ў барацьбе за мяса і малако кармы маюць рашаючае значэньне,—нашы саўгасы і калгасы разгортваюць сіласаваньне кармоў, карыстаючыся ім як спосабам найбольш таннага і хуткага стварэньня буйных запасаў кармоў для сацыялістычных фабрык мяса і малака на ўвесь стойлавы пэрыяд, спрыяючы разам з гэтым і стварэньню сыравіны жывёлагадоўлі для прамысловасьці.

Вам даручан выраб стандартных драўляных сілосных веж. Саўгасы і калгасы прыступілі да закладкі фундамантаў для іх устаноўкі, ужо растуць пасеяныя на сілос спэцыяльныя сілосныя культуры—сланэчнік і кукуруза. Клёпка для вежаў, якую вы выробляеце, павінна прыбыць на месца для тэрміну, каб саўгасы і калгасы змаглі іх устанавіць і загрузіць зялёнай масай.

Між тым, зводкі аб ходзе выпрацоўкі клёпкі для вежаў на вашых заводах сьведчаць аб сур'ёзным прарыве ў вырабе іх. Пры існуючым становішчы ў выпрацоўцы вежаў саўгасы і калгасы ня змогуць сваячасова іх атрымаць.

На сёньняшні дзень выраблена вежаў толькі каля 20 проц. ад заданьня. Тэмпы вырабу вежаў зусім недастатковыя. Трэба думаць, што прычынаю гэтага зьяўляюцца тыя непаладкі з боку адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і паасобных рабочых гэтых заводаў, якія недаацэньваюць важнасьць будаўніцтва сілосных вежаў, важнасьць загатоўкі кармоў для сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Народны Камісарыят Земляробства ад імя саўгасаў і калгасаў БССР зьвяртаецца да вас з заклікам ліквідаваць гэтыя непаладкі, узяць баявыя тэмпы выпрацоўкі вежаў, палепшыць іх якасьць і па прыкладу ленінградзкіх таварышоў, выканаўшых на 1-га чэрвеня 1931 г. 102 проц. праграмы,—выканаць і перавыканаць праграму вырабу вежаў да тэрміну.

Народны Камісарыят Земляробства спадзяецца, што рабочы калектыў вашых заводаў ,партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, тэхпэрсанал і кіруючы склад заводаў выканаюць заказ сацыялістычнай жывёлагадоўлі да тэрміну.

Упаўнаважаны Ўраду БССР па пасеўкампаніі Рачыцкі.

Рабочыя дрэваапрацоўчага камбінату і „Дрэваапрацоўшчыка", прымеце самыя рашучыя меры да ліквідацыі прарываў у выпуску сілосных веж

Да рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату і Менскага заводу „Дрэваапрацоўшчык"

Аднэй з асноўных умоў вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы нашае краіны зьяўляецца стварэньне моцнай кармовай базы. Гэта цесна зьвязана з пытаньнем разгортваньня будаўніцтва сілосных установак.

Наш трэст Белсельбуд, на які ўскладзена важнейшая задача па кіраваньні будаўніцтвам сілосных вежаў па саўгасах і калгасах, упраецца ў немагчымасьць выкананьня гэтай задачы ў сувязі з тым, што Бабруйскі камбінат і Менскі завод «Дрэваапрацоўшчык» ня выконваюць заданьняў ураду па вырабе стандартных сілосных вежаў.

Завод «Дрэваапрацоўшчык» павінен быў выпусьціць да 1-га ліпеня 100 стандартных сілосных вежаў, а выпушчана да 20 чэрвеня толькі 30 камплектаў, з якіх адгружана 20.

Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат замест прадугледжаных на пляну 350 камплектаў, на 20 чэрвеня выпусьціў толькі 50 камплектаў, а адгружана толькі 33 камплекты.

Гэткія тэмпы вырабу вежаў ствараюць вельмі сур'ёзную пагрозу па выкананьні вызначаных партыяй і ўрадам плянаў сіласа-будаўніцтва і сіласаваньня.

Па заданьнях ураду мы павінны цалкам закончыць будаўніцтва сілосных вежаў не пазьней 1-га жніўня 31 году.

Мы зварочваемся да вас—рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу паказаных заводаў аб прыняцьці самых рашучых мер да поўнага і сваячасовага выкананьня вызначаных вам заданьняў па вырабе стандартных сілосных вежаў.

Мы ўпэўнены, што пры згрупаваньні і мабілізацыі ўвагі ўсяе рабочае грамадзкасьці вашых заводаў вакол важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі па будаўніцтву сілосных установак—вы здолееце выканаць і перавыканаць даныя вам заданьні ў вызначаны тэрмін.

Будзем рашуча змагацца за мільён тон сіласу.

Поўнасьцю і ў тэрмін выканаем дырэктывы партыі і ўраду па сілосабудаўніцтву.

Кіраўнік Трэсту Белсельбуду
СЬЛЮКІН.
Сакратар парт'ячэйкі КОХАН.
Старшыня мясцкома СІТЛІН.

Хлопчык Ж. КУДЛАЧ, 7 год з в. Холмік, Грычынскага сельсавету, Менскага раёну, пасьля сходу аб арганізацыі калгасу, першым напрасіў запісаць сябе і яго бацьку ў калгас.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Па дакладу Наркамфіну аб ужытых мерапрыемствах па арганізацыі і узмацненьні сельскіх бюджэтаў

Заслухаўшы даклад Народнага камісара фінансаў БССР тав. **А. І. Хацкевіча** аб ужытых мерапрыемствах па арганізацыі і ўзмацненьні сельскіх бюджэтаў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

1. Адзначыць, што ў выкананьне пастановы III-й Сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня з 1-га студзеня 1931 году ва ўсіх сельскіх саветах уведзены самастойныя сельскія бюджэты з адпаведнай фінансавай базай.

2. На бюджэты сельсаветаў перададзены ўсе ўстановы і мерапрыемствы сельскага значэньня, знаходзячыяся на тэрыторыі сельсаветаў, а па некаторых раёнах, нават, установы, якія маюць міжпасялішчнае значэньне, як на прыклад, школы сямігодкі, больніцы і інш.

3. Сельсаветам перададзены ўсе непадатковыя даходныя крыніцы сельскага значэньня і вызначан процант ад сельскіх падатковых даходаў, пры чым у шмат выпадках дадатковыя даходы (сельгаспадатак і культзбор) перададзены поўнасьцю.

Побач з адзначанымі установаў або за нікамі ў [illegible] «зьяваўздыму вёскі, Прэзыдыум ЦВК прапануе:

1. Сельсаветам забясьпечыць шырокі ўдзел савецкай грамадзкасьці вёскі, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і беднякоў-серадняцкіх мас у рабоце па складаньні і выкананьні сельскіх бюджэтаў, а таксама кантролю за іх выкананьнем, ставячы на абгаварэньне сходаў даклады аб выніках складаньня і выкананьня бюджэту.

2. Райвыканкомам ажывіць дзейнасьць сельскіх рэвізійных камісій ў частцы нагляду за правільным і мэтазгодным выдаткаваньнем сельсаветамі бюджэтных сродкаў, за захаваньнем імі бюджэтнай і касавай дысцыпліны і за своечасовым правядзеньнем у жыцьцё прадугледжаных па бюджэце будаўніцтва і іншых мерапрыемстваў. [illegible] ных газэт, гурэмным вы[illegible] мацніць інструктар[illegible] ня менш 3-х ветаў у справ[illegible] бюджэтных [illegible] прысуджваюцца таксама ку скл[illegible] «якія зьневажаюць публічна і [illegible] або на сходзе дзяржаўны лад вольнага гораду Данцыга, або ўрад, ці члена ўраду» і г. д.

Курс польскага злотага падае

ВАРШАВА, 25. Справаздача польскага банку ў пачатку чэрвеня паказвае нябачнае зьмяншэньне запасу замежных валют, прызначаных для забясьпячэньня злотага.

Зьмяншэньне, якое складае 55 млн. злотых, г. зн. каля 20 проц. усяго запасу, выклікала падзеньнем курсу злотага.

Полымя рэвалюцыі ў Гішпаніі пашыраецца

ПАРЫЖ. 27-VI У Сэвільлі сёньня пачынаецца стачка служачых прадуктовых магазынаў у адзнаку салідарнасьці з бастуючымі рознашчыкамі малака. Губарнатар і вайсковая ўлада прымаюць меры для забясьпячэньня снабжэньня гораду харчамі. Паводле заявы губарнатара ня выключана магчымасьць абвешчаньня ваеннага становішча ў дзень выбараў ва ўстаноўчы сойм (28 чэрвеня).

У Валенсіі, з прычыны забастоўкі трамвайшчыкаў, палкам спынен трамвайны рух. У Сэвілью прыбыў начальнік жандармаў Чан Хурхр, якому даны «неабмежаваныя паўнамоцтвы» для прыдушэньня магчымых непарадкаў.

* * *

ПАРЫЖ. 26-VI. Паводле паведамленьня мадрыдзкай газэты «Эль Соль» 12 тысяч тэкстыльшчыкаў у Тарассе (Каталёнія) абвесьцілі стачку.

У КАМІСІІ ВЫКАНАНЬНЯ

Пастанова Камісіі выкананьня пры СНК БССР

Пра выкананьне прадпрыемствамі ВСНГ БССР ды рэктыў партыі і ўраду пра эканомію апалу

Выслухаўшы даклад прадстаўніка ВСНГ БССР тав. Ноіма і садаклад прадстаўніка НК РСІ БССР тав. Самахвалава, Камісія Выкананьня ўстанаўляе:

1. Дырэктывы ЦК КП(б)Б ад 1-II—1931 г. і СНК БССР аб барацьбе з перапалам паліва і правядзеньні ў выдаткаваньні паліва 15 проц. эканоміі большасьцю прадпрыемстваў ВСНГ ня выканана, а па шэрагу аб'яднаньняў і прадпрыемстваў (Шклоаб'яднаньне, Тэкстыльаб'яднаньне і інш.) ёсьць вялікія перапалы паліва.

2. Пры гэтым Камісія Выкананьня адзначае, што:

а) ВСНГ, прамаб'яднаньні і паасобныя прадпрыемствы да [illegible] у той не наладзілі дасканы сьвет патраў і яканага паліва [illegible] ім і радае магчымасьці працоўных мас усялічэньню да СССР прымусіў сацыялфашыстаў зьмяніць сваю тактыку да анты-савецкага цкаваньня, прымусіў іх адмовіцца ад сьцьвярджэньня аб «блізкай пагібелі» савецкай улады.

Пераходзячы да вывадаў, пленум адзначае, што палітычная лінія, якую вызначыў Лейпцыгскі зьезд, прывядзе да ўзмацненьня рэвалюцыйнай, якія накіроўваліся ў Берсэлону. 10 чал. арыштавана.

У Барсэлоне баставаўшыя рабочыя ўжо 8-мы дзень кіруюць захопленай імі гутай «Зарылья» і кампаніяй дэ Сэнс». Рабочыя выгналі адміністрацыю і паліцыю і спрабуюць у сучасны момант наладзіць вытворчасьць і продаж продукцыі. Работа тармазіцца адсутнасьцю сродкаў на пакупку сыравіны і недахватам тэхнічнага пэрсаналу. Мясцовыя ўлады не адважваюцца прымаць рэпрэсыўныя меры.

Бастуючыя захапілі гуту „Зарыля"

ПАРЫЖ. З розных гарадоў Гішпаніі паведамляюць аб пашырэньні рабочага руху. У ваколіцах Барсэлоны забаставалі сельскагаспадарчыя рабочыя, якія ўваходзяць у нацыянальную канфэдэрацыю працы (анарха-сіндыкалісцкая). Прычынай забастоўкі зьявілася адмаўленьне прадпрыемцаў выканаць патрабаваньні рабочых аб строгім захаваньні 8-гадзіннага рабочага дню і аб увядзеньні зарплаты ў 11 пэзэт у дзень.

Бастуючыя затрымалі фурманкі з гарадніной, якія накіроўваліся ў Берсэлону. 10 чал. арыштавана.

Масавы адказ плаціць падаткі

ПАРЫЖ, 27-6. У Галісьі бурны масавы рух у сувязі з рашэньнем гішпанскага ўраду спыніць пабудову чыгункі Дакороа. Рух прымае нацыянальна-рэвалюцыйны характар. Адбыўшаяся нарада муніцыпалітэтаў і інш. арганізацый галісійскай правінцыі ўчора падала грамадзянскаму губарнатару ў Арэнсе ультыматум, што ў выпадку няпрыняцьця на працягу 20 гадзін рашэньня аб аднаўленьні работ на пабудове ўсе муніцыпалітэты правінцыі пададуць у адстаўку, выбары ва ўстаноўчы сойм будуць байкатавацца і будуць прыпынены пляцяжы падатку.

Учора ўвечары натоўп напаў на палацы грамадзянскага губарнатара і павесіў на будынку муніцыпалітэту нацыянальны галісійскі сьцяг. Сёньня абвешчана ўсеагульная стачка ва ўсёй правінцыі. Губарнатар падаў у адстаўку. У Мадрыдзе вядуцца перагаворы паміж урадам і дэлегацыяй галісійскай правінцыі.

За 50-тысячны тыраж газ. „Савецкая Беларусь"

Усім райкомам КП(б)Б, РК ЛКСМБ, ЮП, райпрафсаветам, райкалгассаюзам, калгасам, [illegible] чытальням, школам, вайсковым аб'яднаньням, райвы[illegible]

[illegible] ла за зьмену 60.100 цаглін пры праграме ў 35.000.

«Палеская Праўда» вядзе правільную бальшавіцкую барацьбу за торф і можа зьявіцца прыкладам для многіх газэт у барацьбе за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду.

Але гэта яшчэ недастаткова. Перад «Палескай Праўдай» паўстае задача давесьці сваю работу да канца, да таго становішча, калі прарывы на торфа заводах Гомельшчыны будуць ліквідаваны і пляны торфаздабычы поўнасьцю выкананы.

* * *

Калі «Палеская Праўда» зьяўляецца прыкладам сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за торф, дык гэта нельга сказаць аб газэце «Ленінскі Прызыў» —орган Аршанскага РК КП(б)Б, РВК і Райпрафсавету.

Дастаткова сказаць, што «Ленінскі прызыў» на працягу 3-х месяцаў не сказаў ніводнага слова аб торфе. А між тым, зьвернемся да становішча буйнейшага тарфянога масыву, як Асінторф, які зьяўляецца крыніцай для забясьпечаньня торфам Белдрэс-у. Тут плян здабычы торфу ня выконваецца.

Трэба сказаць, што Асінторф свой каляндарны плян выконвае на 40 проц., а сэзонны плян выконвае толькі на 15-16 проц. Самы вялікі процант дзеннага здабываньня—гэта 40—45 проц.

Калі ўзяць здабычу фрэзернага торфу, дык тут мы маем катастрафічнае становішча Мы ведаем, што фрэзерны торф самы рацыянальны і карысны. У пастанове ЦК КП(б)Б аб торфе асабліва ўвага аддана здабычы фрэзернага торфу. А тут, на Асінторфе, мы маем шкодныя адносіны да яго. З 5 фрэзерных машын працуюць толькі дзьве.

Такім чынам, на Асінторфе мы наглядаем глубокі прарыў.

Як-жа расьцэньвадь такое зьявішча, што «Ленінскі Прызыў» на працягу 3-х месяцаў не сказаў аб торфе ніводнага слова? Што гэта, калі не апартуністычная недаацэнка значэньня торфу, ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду?

«Ленінскі Прызыў» павінен зараз-жа выправіць сваю памылку, павінен стаць на чале арганізацыі мас у барацьбе за торф, у барацьбе за выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

[illegible] асноўнай базай для разгортваньня электрафікацыі, забясьпечаньня апалам прамысловасьці, культурна-бытавых устаноў і для прамысловай пераапрацоўкі».

На працягу бліжэйшых трох год перад намі пастаўлена задача перавесьці электраўстаноўкі, прамысловасьць і культурна-бытавыя ўстановы, на тарфяны апал.

700.000 тон торфу—вось баявая праграма гэтага году. Зусім зразумела, што гэтая ліча ў параўнаньні са здабываньнем мінулага году вельмі вырасла.

Барацьба за торф, такім чынам, становіцца рашаючым фактарам у разьвіцьці апалавай базы ва ўмовах БССР. На вырашэньне тарфяной праблемы павінны быць накіраваны сілы ўсёй КП(б)Б, рабочае клясы і працоўных БССР.

Між тым, тарфаздабыча гэтага году вельмі нізкая. Сэзонны плян торфаздабычы за апошні час выканан на 30 проц. За апошнія дні апэрацыйныя зводкі з тарфянага фронту прыносяць нам весткі аб тым, што дзённая здабыча ідзе ўсё ніжэй і ніжэй.

Баявая задача друку — мабілізаваць масы на выкананьне дырэктывы партыі і ўраду ў вырашэньні тарфяной праблемы. Задача друку—стаць арганізатарам, стаць на чале апэрацыйнай барацьбы за торф, за ліквідацыю прарываў на тарфяным фронце.

У сёньняшнім аглядзе мы паставілі перад сабой задачу паказаць, як дзьве раённыя газэты «Палеская Праўда» і «Ленінскі Шлях» змагаюцца за торф.

* * *

Пасьля апошняга агляду друку ў «Зьвязьдзе», аб торфе, «Палеская Праўда» выправіла зазначаныя газэтай памылкі. Барацьба «Палескай Праўды» за торф—гэта паказьнік і прыклад таго, як друк павінен змагацца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду.

Увесь час на заводзе **«Шлях Сацыялізму», «Давыдаўцы»** знаходзіцца вызная брыгада газэты **«Палеская Праўда»**, якая ў апошні час аб'ядналася з прадстаўнікамі рэдакцый **«Зьвязда»** і **«Рабочий»**.

Газэта пачала з таго, што кожны дзень зьмяшчала апэрацыйныя зводкі заводаў Гомельшчыны і на канкрэтных прыкладах, на канкрэтных фактах паказвала тыя недахопы, якія маюцца на гэтых прадпрыемствах, мабілізавала масы на ліквідацыю прарываў.

— Брыгады Арцёмава і Галайда, вы не павінны адставаць. Брыгада т. Кавэрды ідзе наперадзе.

Так пісала «Палеская Праўда», паказваючы канкрэтна, як асобная брыгада змагаецца за выкананьне прамфінпляну. Праз некалькі дзён газэта зноў сыгналізуе аб тым, што брыгада Кавэрды пачынае здаваць тэмпы. Брыгада Галайды перавыканала заданьне.

Штодня газэта не выпускае з пад сваёй увагі работу паасобных брыгад, заводаў, «Шлях сацыялізму» і «Давыдаўка», зусім канкрэтна высоўвае задачы перад кожнай брыгадай паасобку і гэтым самым мабілізуе масы на разгортваньне спаборніцтва і ўдарніцтва.

«Палеская Праўда» ставіць пытаньне перад «Рухавіком рэвалюцыі», заводам, якія канкрэтныя задачы стаяць перад спажыўцом торфу ў сэнсе дапамогі яго адстаўшаму торфазаводу.

Барацьбе за фрэзерны торф «Палеская Праўда» аддае шмат увагі.

— На заводзе «Шлях сацыялізму» павінны быць пушчаны ўсе чатыры фрэзеры.

«Палеская Праўда» пад гэтым канкрэтным лёзунгам вядзе барацьбу за здабываньне фрэзернага торфу.

На торфамасывы накіроўваюцца мабілізаваныя камуністы. Ня ўсе мабілізаваныя зьявіліся на работу. Газэта канкрэтна друкуе прозьвішча дэзэртыраў з працоўнага фронту, ганьбіць іх і змагаецца за 100-процантную яўку на торфазавод.

Ня гледзячы на тое, што «Палескай Праўдзе» удалося зрабіць пералом на торфазаводах Гомельшчыны ў бок павялічэньня здабычы, усё-ж прарыў за стаецца вельмі значным.

«Палеская Праўда» апроч апэрацыйнай работы высоўвае цэлы рад мерапрыемстваў, якія павінны былі быць накіраваны на тое, каб ліквідаваць прарыў.

— Увага ручной здабычы торфу, за асваеньне мэханізмам, машына павінна даць усе 100 проц. здабычы, палепшыць дабрабыт тарфянікаў,—за гэта газэта вядзе канкрэтную барацьбу.

Мы лічым, што ў заслугу «Палескай Праўды» трэба аднесьці ўстанаўленьне брыгадай тав. Шчалкунова новага зэта арганізуе сацспаборніцтва паміж заводам «Шлях сацыялізму» і «Давыдаўкай».

У выніку таго, што газэта пільна сачыла за работай паасобных брыгад, на торфазаводах «Шлях сацыялізму» і «Давідаўка» абвяшчаецца месячнік конкурсу на лепшую брыгаду.

З вялікім спазьненьнем «Палеская Праўда» ўключыла ў сваю апэрацыйную работу торфамасыў «Бальшавік». Толькі 12-га чэрвеня «Палеская Праўда» накіроўвае туды сваю брыгаду.

Газэта таксама займалася пытаньнем аб арганізацыі шэфства рабочых папяровай фабрыкі «Героя Працы» над торфазаводам «Шлях сацыялізму». Некалькі разоў запар газэта канкрэтна ставіць пытаньне перад заводзкімі арганізацыямі аб тым, які выгляд павінна прыняць шэфства над торфазаводам, якія канкрэтныя задачы стаяць перад шэфствам.



Дзённае заданьне: 7642 тоны

На 23-VI-31 г. здабыта 3381,8 тоны або 4[illegible],2 проц.

На 24-VI-31 г. здабыта 3252,2 тоны або 39,7 проц.

На 25-VI-31 г. здабыта 3153,1 тоны або 38,5 проц.

Дасьпехі ў барацьбе за торф, такім чынам, ня ўсе. Ня ўсе ў сваю апэрацыйную работу торфамасыў «Бальшавік». Толькі 12-га чэрвеня «Палеская Праўда» накіроўвае туды сваю брыгаду.

Газэта таксама займалася пытаньнем аб арганізацыі шэфства рабочых папяровай фабрыкі «Героя Працы» над торфазаводам «Шлях сацыялізму». Некалькі разоў запар газэта канкрэтна ставіць пытаньне перад заводзкімі арганізацыямі аб тым, які выгляд павінна прыняць шэфства над торфазаводам, якія канкрэтныя задачы стаяць перад шэфствам.

Сказаў ніводнага слова аб торфе. А між тым, зьвернемся да становішча буйнейшага тарфянога масыву, як Асінторф, які зьяўляецца крыніцай для забясьпечаньня торфам Белдрэс-у. Тут плян здабычы торфу ня выконваецца.

Трэба сказаць, што Асінторф свой каляндарны плян выконвае на 40 проц., а сэзонны плян выконвае толькі на 15-16 проц. Самы вялікі процант дзеннага здабываньня—гэта 40—45 проц.

Калі ўзяць здабычу фрэзернага торфу, дык тут мы маем катастрафічнае становішча Мы ведаем, што фрэзерны торф самы рацыянальны і карысны. У пастанове ЦК КП(б)Б аб торфе асабліва ўвага аддана здабычы фрэзернага торфу. А тут, на Асінторфе, мы маем шкодныя адносіны да яго. З 5 фрэзерных машын працуюць толькі дзьве.

Такім чынам, на Асінторфе мы наглядаем глубокі прарыў.

Як-жа расьцэньвадь такое зьявішча, што «Ленінскі Прызыў» на працягу 3-х месяцаў не сказаў аб торфе ніводнага слова? Што гэта, калі не апартуністычная недаацэнка значэньня торфу, ігнараваньне дырэктыў партыі і ўраду?

«Ленінскі Прызыў» павінен зараз-жа выправіць сваю памылку, павінен стаць на чале арганізацыі мас у барацьбе за торф, у барацьбе за выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

У бой за суцэльную пісьменнасьць,

за бальшавіцкія тэмпы ў падрыхтоўцы да навучальнага году

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКАГА СЯЛЯНСТВА, КАМСАМОЛЬЦАЎ, КУЛЬТАРМЕЙЦАЎ, НАСТАЎНІКАЎ, НАВУКОВЫХ І ПАЛІТЫКА - АСЬВЕТНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ БССР.

Пад сьцягам партыі Леніна працоўныя Савецкага Саюзу, у тым ліку і Савецкай Беларусі пасьпяхова ажыцьцяўляюць пяцігодку ў чатыры гады, ператвараюць у сапраўднасьць Ленінскі наказ—«дагнаць і перагнаць у найкарацейшы тэрмін капіталістычныя краіны».

На базе індустрыялізацыі краіна саветаў дасягнула нябывалага росту на ўсіх фронтах і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва і, у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, завяршае фундамант сацыялістычнай эканомікі.

Савецкая Беларусь, якая ў часе царызму была прыгнечанай, пры братэрскім падтрыманьні ўсяго Савецкага Саюзу, пад выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай Партыі бальшавікоў Беларусі крок за крокам ідзе па шляху перамаганьня эканамічнай і культурнай адсталасьці, па шляху ператварэньня ў краіну фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, і суцэльнай пісьменнасьці.

Магутны размах індустрыялізацыі, калектывізацыі і сацыялістычнай культуры Савецкай Беларусі — дасягнуты ў выніку ажыцьцяўленьня Ленінскай нацыянальнай палітыкі і жорсткай барацьбы супроць клясавага ворагу.

Культурная рэвалюцыя ёсьць адна з галоўнейшых праблем рэканструкцыйнага пэрыяду і ад вырашэньня яе залежаць далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва,—таму наша партыя, побач з задачамі індустрыялізацыі і калектывізацыі, ставіць па баявому пытаньне культурнага будаўніцтва. Ператварэньне Савецкай Беларусі ў краіну суцэльнай пісьменнасьці; шырочайшы пераход у сьлед за поўным ахопам у гэтым годзе абавязковым навучаньнем у аб'ёме пачатковае школы,—да ўсеагульнага навучаньня за сямігодку; палітэхнізацыя ўсяе народнае асьветы, масавае разгортваньне палітэхнічнага і прафэсыянальнага навучаньня сярод рабочых і калгасьнікаў і аўладаньне імі тэхнікай; разгортваньне дашкольных устаноў з разьлікаху ахопу імі ўсіх дзяцей работніц і калгасьніц; разгортваньне сыстэмы, калгасных, рабочых унівэрсытэтаў, завочнага навучаньня падрыхтоўчых курсаў і рабфакаў з мэтай забясьпячэньня адпаведнымі кантынгентамі ФЗВ, тэхнікумаў і ВНУ па ўсіх галінах народнае гаспадаркі і культуры; рашучы паварот работы палітыка-асьветных устаноў і ўсяе масавае палітыка-асьветнае работы да выкананьня прамфінпляну і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на сацыялістычных падставах — вось: асноўныя задачы культурнага будаўніцтва, за выкананьне якіх павінен змагацца па бальшавіцку кожны рабочы, калгасьнік, бедняк, серадняк - аднаасобнік, камсамолец і працоўны інтэлігент, а змагацца за іх выкананьне—гэта значыць,—змагацца за пяцігодку ў чатыры гады, за выкананьне 3-га рашаючага—за сацыялізм.

Таварышы рабочыя, калгасьнікі, беднякі, сераднякі - аднаасобнікі, камсамольцы, настаўнікі, навуковыя і культурна-палітасьветныя працаўнікі!—Вы ведаеце, што пры наяўнасьці значных дасягненьняў у галіне культурнага будаўніцтва ў цэлым, на паасобных вучастках ёсьць сур'ёзныя недахопы і прарывы,—галоўныя з якіх: зусім слабая работа шмат на якіх заводах, фабрыках, калгасах, саўгасах і вёсках па ліквідацыі няпісьменнасьці; прадугледжаныя на пляну да адчыненьня дашкольныя ўстановы,—да гэтага часу ня ўсюды адчынены; культурна-палітасьветныя ўстановы, у сваёй большасьці, не перабудавалі і не падпадкавалі сваёй работы задачам сацыялістычнага будаўніцтва; недастатковымі тэмпамі праходзіць будаўніцтва, ремонт, абсталяваньне школ і наогул падрыхтоўка да навучальнага году,—усё гэта стварае непасрэдную пагрозу зрыву баявых дырэктыў партыі і ўраду па важнейшых пытаньнях культурнага будаўніцтва і патрабуе зараз-жа і безадкладна прыняць усе захады да зьяўшчэньня гэтых ненармальных зьявішч.

Пэўнае і чоткае выкананьне задач культурнага будаўніцтва магчыма толькі пры адной умове, калі за іх выкананьне будуць змагацца сотні і тысячы пралетарыяў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, працоўная інтэлігенцыя і пралятарская грамадзкасьць у цэлым.

Культэстафэта зьяўляецца такой формай, праз якую мабілізуюцца працоўныя масы на барацьбу за сацыялістычную культуру.

Культэстафэта — ёсьць праява сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў перабудовы краіны ў сацыялістычную.

Культэстафэта—ёсьць лепшая форма змаганьня цэлых атрадаў працоўных мас за пабудову новага быту.

Таварышы рабочыя, калгасьнікі, беднякі, сераднякі - аднаасобнікі, камсамольцы, настаўнікі, навуковыя і культурна-палітасьветныя працаўнікі!—Вы ведаеце, што пры наяўнасьці значных дасягненьняў у галіне культурнага будаўніцтва ў цэлым, на паасобных вучасткох ёсьць сур'ёзныя недахопы і прарывы,—галоўныя з якіх: зусім слабая работа шмат на якіх заводах, фабрыках, калгасах, саўгасах і вёсках па ліквідацыі няпісьменнасьці; прадугледжаныя на пляну да адчыненьня дашкольныя ўстановы,—да гэтага часу ня ўсюды адчынены; культурна-палітасьветныя ўстановы, у сваёй большасьці, не перабудавалі і не падпадкавалі сваёй работы задачам сацыялістычнага будаўніцтва; недастатковымі тэмпамі праходзіць будаўніцтва, ремонт, абсталяваньне школ і наогул падрыхтоўка да навучальнага году,—усё гэта стварае непасрэдную пагрозу зрыву баявых дырэктыў партыі і ўраду па важнейшых пытаньнях культурнага будаўніцтва і патрабуе зараз-жа і безадкладна прыняць усе захады да зьяўшчэньня гэтых ненармальных зьявішч.

Пэўнае і чоткае выкананьне задач культурнага будаўніцтва магчыма толькі пры адной умове, калі за іх выкананьне будуць змагацца сотні і тысячы пралетарыяў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, працоўная інтэлігенцыя і пралятарская грамадзкасьць у цэлым.

Культэстафэта зьяўляецца такой формай, праз якую мабілізуюцца працоўныя масы на барацьбу за сацыялістычную культуру.

Культэстафэта — ёсьць лепшая форма змаганьня цэлых атрадаў працоўных мас за пабудову новага быту.

Таварышы рабочыя, калгасьнікі, беднякі, сераднякі - аднаасобнікі, камсамольцы, настаўнікі, навуковыя і культурна-палітасьветныя працаўнікі!—Вы ведаеце, што пры наяўнасьці значных дасягненьняў у галіне культурнага будаўніцтва ў цэлым, на паасобных вучасткох ёсьць сур'ёзныя недахопы і прарывы,—галоўныя з якіх: зусім слабая работа шмат на якіх заводах, фабрыках, калгасах, саўгасах і вёсках па ліквідацыі няпісьменнасьці; прадугледжаныя на пляну да адчыненьня дашкольныя ўстановы,—да гэтага часу ня ўсюды адчынены; культурна-палітасьветныя ўстановы, у сваёй большасьці, не перабудавалі і не падпадкавалі сваёй работы задачам сацыялістычнага будаўніцтва; недастатковымі тэмпамі праходзіць будаўніцтва, ремонт, абсталяваньне школ і наогул падрыхтоўка да навучальнага году,—усё гэта стварае непасрэдную пагрозу зрыву баявых дырэктыў партыі і ўраду па важнейшых пытаньнях культурнага будаўніцтва і патрабуе зараз-жа і безадкладна прыняць усе захады да

Таварышы камсамольцы—шэфы ўсе обуча, пакажэце сапраўдны бальшавіцкі ўзор барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, за ўсеобуч. Усе сваё сілы, ўсю сваю творчую энэргію накіруйце на разгортваньне культурнага будаўніцтва.

Таварышы культармейцы, добраахвотная армія культ. байцоў на фронце культурнае рэвалюцыі—падхапляйце заклік камэндэрнаўцаў, узьнімайце хвалю сустрэчных культплянаў, змагайцеся за хутчэйшыя тэмпы ў ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, дабівайцеся сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце па падрыхтоўцы да новага навучальнага году; забясьпечце будаўніцтва, рамонт і абсталяваньне школ, арганізуйце суботнікі па дапамозе школе; лепшых з сваіх шэрагаў вылучайце для непасрэднай работы на лініі культ. будаўніцтва, рашуча дабівайцеся ператварэньня культурна-палітыка-асьветных устаноў у сапраўдныя ачагі камуністычнага выхаваньня працоўных; забясьпечце выкананьне плянаў па масаваму дашкольнаму выхаваньню мабілізаваўшы вакол гэтага пытаньня ініцыятыву самых працоўных; дайце магчымасьць усім калгасьніцам прыняць актыўны ўдзел ў бальшавіцкай уборачнай кампаніі.

Таварышы чырвона-штандарнае настаўніцтва, навуковыя і культурна-палітыка-асьветныя працаўнікі, вы—перадавы атрад-авангард культармі вашае мейсца на перадавых пазыцыях культфронту,—атакуйце слабыя вучасткі, змагайцеся на аснове рэвалюцыйных мэтадаў працы,—соцпаборніцтва і ўдарніцтва, за колькасныя і жакасныя паказчыкі выкананьня культплану.

Будзем-жа змагацца пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі за рэвалюцыйныя тэмпы культурнай рэвалюцыі, за чыстату пралетарскай ідэалёгіі ў рабоце культурна-палітыка-асьветных устаноў, за падпарадкаваньне іх работы задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Усе ў паход за сацыялістычную культуру.

Усе ў шэрагі культбайцоў за выкананьне дырэктыў Партыі.

У бой за перабудову грамадзтва, выхаваньне новага чалавека—змагара сацыялізму.

Няхай жыве КП(б)Б—адзіны і сапрадны кіраўнік культурнага будаўніцтва!

Усебеларускі штаб культэстафэты.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Двухмесячнік мабілізацыі рэсурсаў

Даць прамысловасьці лішкі чорных і каляровых мэталяў

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б, калегіі НК РСІ БССР і прэзыдыуму ВСНГ БССР

22 чэрвеня 1931 году

Пастановай партыі і ўраду, надрукаванай у газэце «Известия ЦИК СССР» ад 2-VI—1931 г., за № 150, абвешчана з пачатку чэрвеня 2-х месячнік мабілізацыі рэсурсаў па выяўленьні лішкавых фондаў чорных і каляровых мэталяў, а таксама мэталёвага лому ўсіх відаў.

Адзначаючы актуальную важнасьць гэтай пастановы для пасьпяховага выкананьня задач народна-гаспадарчага пляну на 1931 г. ўлічваючы неабходнасьць арганізаванага кіраўніцтва работай па правядзеньні 2-х месячніка ў БССР, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б, НК РСІ, ВСНГ БССР **пастанаўляюць:**

1. Стварыць пры прэзыдыуме ВСНГБ цэнтральны штаб па кіраўніцтве правядзеньнем 2-х месячніка ў складзе нам. старшыні ВСНГ БССР тав. Амбражунаса (старшыня штабу), прадстаўніка ад ЦКК РСІ, прадстаўніка АДПУ і прадстаўніка ЦСПСБ.

2. На дырэктараў прадпрыемстваў укладаецца пэрсанальная адказнасьць за своечасовае правядзеньне ўліку фактычнай наяўнасьці мэталю і за дасканалае выкананьне заданьняў аб здачы і адгрузцы мэталёвых рэсурсаў, якія падлягаюць пераразьмеркаваньню.

3. Для апэрацыйнага правядзеньня ўсёй работы па ўліку і мабілізацыі мэталёвых рэсурсаў на прадпрыемствах і транспарце арганізуюцца «чацьвёркі» ў складзе прадстаўнікоў заўкому (на чале «чацьвёркі»), ячэйкі, агульнай-заводзкай вытворчай камісіі і КСМ.

4. Адзначаным чацьвёркам безадклад на прыступіць да працы па выяўленьні лішкаў мэталёвых рэсурсаў, уключаючы сюды непатрэбнае і лішняе абсталяваньне, кіруючыся ў сваёй рабоце даданай пры гэтым дэталёвай інструкцыяй.

5. Абавязаць дырэктараў прадпрыемстваў па-дэкадна, на працягу чэрвеня і ліпеня г. г. прадстаўляць зводкі аб ходзе работы ў штаб пры ВСНГ БССР, копіі—Мэталялому, а ў частны абсталяваньня — Рэммаштрэсту.

Зводкі павінны прадстаўляцца не пазьней наступнага дня за справаздачнай дэкадай (11, 21 і 1) па формах, даданых да інструкцыі.

6. Мэталялому, Усепрамутылізацыі, Рэммаштрэсту і Стальзбыту:

а) забясьпечыць усе прадпрыемствы адпаведным тэхнічным інструктажам;

б) правесьці ассартоўку, разьдзелку і транспартоўку мэталёвых рэсурсаў, якія падлягаюць утылізацыі;

в) устанавіць падэкадную рэгулярную справаздачнасьць аб ходзе мабілізацыі мэталёвых рэсурсаў і прадстаўляць такую не пазьней як праз 3 дні па скончэньні справаздачнай дэкады ў цэнтральны штаб;

г) вызначыць спэцыяльны фонд для прэміраваньня лепшых прадпрыемстваў, брыгад, паасобных рабочых ударнікаў, за лепшы ўлік і выяўленьне мэталёвых рэсурсаў.

7. Прапанаваць гарадзкім і раённым КК РСІ прыняць актыўны ўдзел у рабоце па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, забясьпечыўшы правядзеньне масавых налётаў на прадпрыемствы і сапраўдную праверку фактычнай наяўнасьці мэталёвых рэсурсаў (мэталю, абсталяваньня, лому) і выяўленьне запасаў, падлягаючых пераразьмеркаваньню.

8. На бліжэйшым пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б—калегіі НК-РСІ заслухаць даклады Мэталялому, Усепрамутылізацыі і Раммаштрэсту з суладкладам штабу аб ходзе 2-х месячніка.

Старшыня ЦКК НКРСІ **Калнін.**
Старшыня ВСНГ БССР **Грыгевіч.**

Больш увагі трэцяму пакаленьню

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Савецкі Саюз уступіў у пэрыяд сацыялізму. У краіне Саветаў адбыліся вялізарныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя зрухі за першыя два гады пяцігодкі. Дзякуючы правільнай генэральнай лініі камуністычнай партыі і выпрабаванаму кіраўніцтву Ленінскага ЦК, рабочая кляса перамагае на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. У выніку гэтага разам з агульным палепшаньнем становішча рабочае клясы і ўсіх працоўных палепшаецца становішча дзяцей, і праца сярод дзяцей. Работа сярод дзяцей, ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня, разгорнутая барацьба за політэхнізм, барацьба за тое, каб забясьпечыць выхаваньне праз школу пакаленьня «здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм» — сталі ў ва ўсю шырыню перад Камуністычнай партыяй, савецкім урадам і ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю Саюзу ССР.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне з асаблівай сілай высоўвае перад партыяй, камсамолам і ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю задачу замацаваньня ўсіх зьвеньняў камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Шэсьць месяцаў таму назад партыйна-камсамольская і прафэсыйная канфэрэнцыя па піанэр-руху канстатавала:

«Адным з важнейшых вучасткаў клясавай барацьбы зьяўляецца барацьба за дзяцей. Клясава-варожыя элемэнты вядуць барацьбу за падрастаючае пакаленьне, імкнуцца накіраваць яго супроць партыі і камсамолу.

Адсюль перад намі, як ніколі, з усёй вастратой паўстае задача ўзмацненьня камуністычнага выхаваньня дзяцей працоўных, шляхам прыцягненьня іх да практычнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Гэта патрабуе з другога боку рашучага павароту ўсёй пралетарскай грамадзкасьці да выхаваньня мас працоўнай дзяцьвы».

Два гады прайшло з таго часу, як адбыўся Першы Ўсебеларускі Зьлёт Піанэраў. Гэта два гады актыўнай дзейнасьці піанэрскай арганізацыі і пад яе кіраўніцтвам усёй працоўнай дзяцьвы на франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта два гады дапамогі з боку дзяцей працоўных. партыі і камсамолу, уладзе ў выкананьні першых двух год пяцігодкі.

Урад БССР уручыў піанэрам дзяржаўнае заданьне, ў якім вызначыў шляхі дзейн

Рапарт-пераклічку

аб дзейнасьці РМК фінансава-банкаўскіх работнікаў па распаўсюджваньні пазыкі

праводзяць „Савецкая Беларусь“ і ЦП саюзу ФБР

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» і ЦП Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў праводзяць рапарт - пераклічку аб дзейнасьці РМК фінансава - банкаўскіх работнікаў па распаўсюджваньні пазыкі «3 рашаючага году пяцігодзьдзі».

Асноўныя моманты пераклічкі: як РМК ФРБ здольны па баявому правесьці работу змагаючыся за пяршынства выкананьня сутрэчных плянаў рэалізацыі пазыкі па сваім раёне. Яная грамадзкая работа імі праведзена па аказаньні дапамогі прадпрыемствам, установам, калгасам, саўгасам, вёснам. Ян гэта гаспадарча-палітычная кампанія была ўвязана з правядзеньнем іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

Пераклічка пачынаецца з дню апублікаваньня гэтай аб'явы па 10 ліпеня, ставячы перад сабою задачу хутчэйшага завяршэньня работы па гарадох і мястэчках, пераключаючы работу на вёсну, спарыстаўшы мэтады перадавых прадпрыемстваў гораду.

Матар'ялы дасылайце рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь» і ЦП Саюзу ФБР.

Сакратар ЦК Саюзу ФБР ПАРХОМЕНКА.

Камсоды Бабруйску, падцягнецеся

Бабруйск. (Белта). Арганізацыі і камсоды па Бабруйску не разгарнулі дастатковай працы па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» ў правядзеньні дэкадзьніка. На 26-га чэрвеня падпісканю ахоплена рабочых і служачых 73 пр., што складае 65 проц. месячнага заробку. Упередзе па падпісцы ідзе Сыпіртавы завод, які ахапіў падпіскаю ўсіх рабочых на 103 проц. месячнага акладу. Фанэрны завод ахапіў падпіскаю ўсіх рабочых на 81 проц. месячнага заробку. Астатнія прадпрыемствы адстаюць у рэалізацыі пазыкі. Камісіі садзейнічаньня бяздзейнічаюць. Раённай камісіяй садзейнічаньня разгорнуцца праца па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Хто ўперадзе і хто адстае

Магілёў. (Белта). Па Магілёве рэалізавана пазыкі «3-га рашаючага» на 1.220.000 руб. Ахоплена падпіскай 12.216 рабочых і служачых, што складае па месячным заробку рабочых і служачых гораду—80,4 проц.

Упередзе ідуць:—шоўкавая фабрыка —89 проц. месячнага заробку, завод «Пралетары»—90 проц., хлебазавод—95 проц., гарбарні імя тав. Сталіна—86 проц.

Ганебна адстаюць у рэалізацыі пазыкі: швэйная фабрыка—58 проц., завод «Адраджэнец»—64 проц., Трансторой—47 проц. Беларуская рэспубліканская будканторa менш як на 50 пр. выканаўшая кантрольную лічбу падпіскі.

Віцебск... адставаць

Віцебск. (Белта). Нарада сакратароў партячэек 26-га чэрвеня абавязалася ў 3-х дзённы тэрмін поўнасьцю закончыць падпіску на пазыку «3-га рашаючага». На 27-га чэрвеня рэалізавана пазыкі па горадзе на 95 проц. кантрольнай лічбы на суму 3.176.200 руб.

Віцебск, ... сход калгасьн... хлёўскага пастаў... пазыку «3-га раша... калгасам на 50 рус... праўленьня—па 10 ру... гасной сям'і — на 5 руб... выклікалі на сацыпаборніцтва ка... «Шлях сацыялізму»

Выправіць дапушчаныя памылкі

Віцебск, (Белта). Сярод рабочых і служачых абутковай фабрыкі імя Лекерта рэалізавана пазыкі на 60 проц. У камісіі садзейнічаньня працуюць толькі паасобныя члены, ды і тыя да цэхаў не прымацаваны. У рабоце камісіі садзейнічаньня дапушчаны грубыя памылкі; камісія дазволіла збываць аблігацыі ранейшых пазык. Паасобныя актывісты-камсамольцы падпісваюцца менш месячнага заробку. Гарком КП(б)Б у сваёй пастанове прапанаваў парткалектыву ф-кі безадкладна выправіць дапушчаныя памылкі і разгарнуць масава-палітычную работу ва ўсіх зьвеньнях прадпрыемства, з тым, каб забясьпечыць ў бліжэйшыя дні поўны ахоп падпіскай усіх партыйцаў, камсамольцаў і рабочую масу ня менш месячнага заробку.

Заданьне перавыканаем

Менскае аддзяленьне Дзяржбанку 27 чэрвеня выканала заданьне па пазыцы „3-ці рашаючы“

Гаркому КП(б)Б, Гарсавету, Гарпрафсавету

Менскае аддзяленьне дзяржбанку рапартуе, што кантрольнае заданьне на пазыку «3-га рашаючага году» ў суме 1.645.660 руб. 27 чэрвеня, у 2 г. дню выканана на 100 проц., пры шырокім удзеле ўсяго банкаўскага калянтыву і грамадзкіх арганізацый.

У першых радох па падпісцы ідуць прадпрыемствы і ўстановы: Лямцава-вяровачная фабрыка «Чырвоны Кастрычнік», Камвуз, Друкарня Камвузу, арцель «Чырвоны Транспортнік», якія перавыканалі фонд месячнага заработку.

Калентыў Дзяржбанку завярае, што прыложыць максымальныя сілы для перавыкананьня заданьня.

Кіраўнік Менскага аддзяленьня Дзяржбанку Кейлін.

Сакратар Партканлентыву Філатаў.

Старшыня мясцкому Гольдберг.

НОВЫ ЗАКОН АБ СЕЛЬГАСПАДАТКУ ВЫКЛІКАЕ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

54 гаспадаркі Ельскага раёну новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку і ільготах калгасам сустрэлі ўступленьнем у калгасы

Новы закон аб с-г. падатку

выклікаў масавы прыліў у калгасы

(Ельскі раён).

Падрыхтоўчая работа па абмеркаваньні пляну працы сельгаспадатку праходзіла з 27-га па 29-га мая. Група беднаты пры сельсавеце разам з сельскай падатковай камісіяй у першую чаргу ўзялася за аслабаненьне бядняцкіх гаспадарак і за выяўленьне кулацкіх гаспадарак.

Пасьля ўсебаковага абгаварэньня, пастаноўлена аслабаніць ад уплаты сельска-гаспадарчага падатку 21 бядняцкую гаспадарку па ўсім сельсавеце.

Выяўлена 19 кулацкіх гаспадарак па сельсавеце. Выяўлена 35 аднаасобных гаспадарак толькі па вёсцы Рамязы, маючых каньюнктурныя прыбыткі. У астатніх вёсках гаспадаркі, якія маюць каньюнктурныя прыбыткі, будуць выяўляцца на працягу вучоты, з папярэднім абгаварэньнем на бядняцкіх і калгасных сходах.

2-га чэрвеня праведзены сход беднаты разам з калгасьнікамі, на якім падрабязна абгаворана: новы закон па с.-г. падатку, ільготы па падатку і парадак вучоты, а таксама разглядаўся спіс бядняцкіх гаспадарак на аслабаненьне. Абгаварваўся спіс кулацкіх гаспадарак вёскі Рамязы.

У выніку праробленай работы, узьніклі беднякі і серадняцкі ад калгаснай справы, за выкананьне пасеўнага пляну, пасыпаліся заявы ў калгасы ад беднякоў і сераднякоў, зьявіліся дэлегацыі ў сельсавет ад вёсак і пасёлкаў з хадайніцтвам: «Дайце нам прадстаў нікоў, у нас хочуць ісьці ў калгас і выканаць план пасеўкампаніі калгасных шляхам. Мы абагульваем свае пасевы і сваю маёмасьць».

Партячэйка разам з сельсаветам і праўленьнем калгасу «Бальшавік» пры дапамозе прадстаўнікоў ад РВК выслучыла брыгаду ў вёску Аляксандраўка і ў пасёлак Зажалка.

У выніку работы брыгад у вёсцы Аляксандраўка, у якой быў калгас з 7 гаспадарак, уступілі калгас з 7 гаспадарак, уступілі калгас у калгас апошнія 24 двары і прыступілі да сяўбы. Пасёлак Зажалка цалкам уступіў у калгас у ліку 11 двароў і таксама прыступіў да калгаснай сяўбы. Гэты пасёлак будзе лічыцца аддзяленьнем калгасу «Бальшавік».

Незалежна ад гэтага падана 10 заяў ад гаспадарак вёскі Рамязы аб прыняцьці іх у калгас. «Бальшавік». Ад 6 гаспадарак паступіла заява ў калгас «Чырвоны Араты» з вёскі Шарына, 3 гаспадаркі в. Лыжкі падалі заявы аб прыняцьці іх у калгас. Усе яны не чакаюць фармальнага прыёму ў калгас і прыступаюць зараз да працы.

Прыліў у калгас ёсьць, трэба, яго паскорыць, разгортваючы масавую растлумачальную работу вакол с-г. падатку ды ільготах.

Марозаў.

У выніку пералому ў мабілізацыі сродкаў

Наркамфін Саюзу адмяніў сваю пастанову аб скарачэньні датацыі для БССР

У зьвязку з тым, што ў БССР за апошні час праведзены цэлы рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, намеціўся пералом ў гэтай рабоце.

Таму Калегія Наркамфіну Саюзу ССР адмяніла сваю пастанову ад 27 красавіка аб скарачэньні для БССР датацыі з агульнага падатку абаротам у 4 мільёны рублёў. (ТАСС).

Зводка

выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва па раёнах БССР за II квартал 1931 г.

(У процантах на 20 чэрвеня)

Азарыцкі—31,6, Асьвейскі—50,3, Асіпавіцкі, — 68,5, Аршанскі,—81,2, Багушэўскі—42,4, Бабруйскі —43,3, Бешанковіцкі—48,7, Брагінскі, 41,6, Буда-Кашалёўскі — 39,9, Быхаўскі—38,9, Бялыніцкі—42,2, Барысаўскі—52,7, Бягомльскі—41,5, Бярэзінскі—44,2 Высачанскі—45,3, Ветка́ўскі—48,9, Валынецкі—32, Ветрынскі—36,9 Вульскі—36,2, Вушацкі—42,1, Горацкі—52, Глускі—60,1, Гарадоцкі—43,3 Гроскі—35,8, Дрыбінскі—41,2, Дубровенскі—31,7, Дрысенскі—21,4, Ельскі—47,9, Жлобінскі—48, Журавіцкі—52 6, Жыткавіцкі—55,1, Заслаўскі—50,8, Коханаўскі—46,3, Круглянскі—40,7, Крупскі—41,1, Клічаўскі—54,3, Камарынскі—51,6, Карнянскі—40,8, Касьцюковіцкі—49,7, Клімавіцкі—50,9, Чырвонапольскі—44,8 Крычаўскі—58,8, Капаткевіцкі—34,7, Капыльскі—53,3, Койданаўскі—64,2, Лядзянскі—34,5, Любанскі — 48,7 Лёзьнянскі—24,3, Лоеўскі—29,7 Лельчыцкі—61,1, Лагойскі—28, Лепельскі—67,4, Мазырскі—53,6, Мсьціслаўскі—57,6, Межанскі—75,4, Магілеўскі—60,4, Нараўлянскі—42,4, Парыцкі—47,4, Прапойскі—49,8 Петрыкаўскі—47,6, Плешчаніцкі—42,2, Пухавіцкі—32,3, Полацкі—50,2, Расьнянскі—46,7, Рагачоўскі—58,6, Рэчыцкі—56,4, Расонскі—65,2, Слуцкі—63,5, Стара-Дароскі—37, Старобінскі—51,2, Сьвіслаўіцкі—62,5, Сіроцінскі—60,2, Сураскі—41,7, Сеньніскі—44,8, Смаляв'цкі—44,9, Сьмілавіцкі—53,6, Талочынскі—34,4, Тураўскі 72 5, Уэўдзенскі—47, Уваравіцкі—56,4, Хойнікі—54,4, Хоцімскі—62,1, Халопеніцкі—41,5, Церахаўскі—57,1, Чарэйскі—52,9, Чырвона-Слабодзкі—46,7, Чашніцкі—38,9, Чачэрскі—47,7, Чавускі—41,1, Чачэвіцкі—29,3, Чэрыкаўскі—45,5, Чэрвенскі—52, Шклоўскі—38,9, Юравіцкі—44,3, Копыскі—58,8.

Гарады: Менск—66,1,—Віцебск—71,3, Гомель—72,1.

Сярэдні процант выкананьня па БССР—59,8.

Толькі брыгадным мэтадам

Выканаем пляны лесазагатовак і лесасплаву трэцяга рашаючага

Брыгадны мэтад работы, перанесены на лесазагатоўкі з сацыялістычных заводаў і фабрык, хутка перацягнуў на свой бок перадавых лесарубаў - ударнікаў. Усяму Савецкаму Саюзу вядомы зараз брыгады Бранцава і Савінцава з Паўночнага краю, брыгада Панюўскага з Карэліі. Ёсьць і ў нас у Савецкім Беларусі, нямала лесасечных брыгад, якія даказалі сваёй работай перавагу сваёй сацыялістычнай формы працы.

Лесарубы Паўночнага краю, за імі лесарубы і іншых раёнаў Савецкага Саюза, перанесьлі брыгадны мэтад працы і на лесасплаў.

Зараз, калі сплаў у нас на Беларусі ўступае ў адказьнейшы пэрыад—летні,—калі разгортваецца месячнік лесазагатовак і лесавывазкі, у гэты самы час на брыгады ускладаюцца выключна вялікія і адказьнейшыя задачы. Паглядзім, ці спраўляюцца брыгады з гэтымі задачамі? ці здолелі гаспадарнікі і прафарганізацыі стварыць належныя ўмовы для ўкараненьня брыгаднага мэтаду працы ў лесе і на раце, для ўзмацненьня існуючых брыгад?

Брыгадны мэтад павялічыў прадукцыйнасьць працы

Правільна арганізаваныя брыгады Сожскіх плытагонаў і Гомельскіх лесарубаў даюць узорныя прыклады высокай прадукцыйнасьці працы.

Напрыклад, вязчыкі плытоў на прыстані «Чырвоны Берег», арганізаваўшыся ў брыгады, павялічылі сваю вытворчую выпрацоўку, амаль у 2 разы. Лесасечная брыгада тав. Вольскага ў Веткаўскім Вучлесгасе выпрацоўвае на кожнага лесаруба ў два разы больш за ўсіх астатніх лесарубаў.

Мы маем факты, калі у тым-жа самым «Чырвоным Берэзе» лепшыя з 44 брыгад плытагонаў, арганізаваных у Ніжне-Сожскім вучастку, сваім вопытам бліскуча на справе даказалі перавагу брыгаднага мэтаду працы.

На прыстані «Чырвоны Берег» да брыгаднага мэтаду 6 рабочых вязалі за дзень толькі 80 бунтоў. Зараз тыя-ж 6 чалавек, арганізаваныя ў брыгады, пачалі вязаць 135 бунтоў у дзень.

Дрэннае кіраўніцтва давяло да развалу брыгады

Побач з гэтым, мы маем і такія факты, калі там, ці сям брыгады развальваюцца. Вось, што аб сваёй брыгадзе расказвае лесаруб Веткаўскага Вучлесгасу тав. Рачкоў: «Мы, 8 Старасельскіх лесарубаў, вышаўшы на працу ў Шабрынскую дачу, Гомельскага Лесправгасу, арганізаваліся ў брыгаду. Разьмеркавалі паміж сабою абавязкі такім чынам: 2-х паставілі валяць, 2-х раскрыжоўваць і т. д. І што-ж атрымалася? За першы дзень наша брыгада вырабатала толькі 12 куб. мтр. драўніны. Атрымалася гэта толькі таму, што адны працавалі добрасумленна, а другія гультайнічалі. Я быў, кажа т. Рачкоў абраны брыгадзірам, але-ж што-ж я мог зрабіць? калі скажаш—хлопцы, не сядзеце без справы,—дык яны на гэта і ўвагі не зьвяртаюць. На другі-ж дзень, мы адмовіліся ад брыгаднага мэтаду, наша брыгада развалілася і мы сталі працаваць парамі. Я, ў пары з таварышом выпрацаваў 4 куб. мэтр.».

У нас няма падстаў лічыць цяперашняга калгасьніка, брыгадзіра, тав. Рачкова, ворагам брыгаднага мэтаду. У даным выпадку прычыны развалу брыгады адсутнасьць цьвёрдых ведаў справы брыгадзіра і ў поўнай адсутнасьці дапамогі яму з боку кіраўнікоў Лесправгасу.

На жаль, мы павінны заявіць, што брыгады у Гомельскім Лесправгасе і Сожска-Дняпроўскім басэйне карыстаюцца поўнай няўважлівасьцю з боку гаспадарнікаў і прафработнікаў, бо прыведзеныя факты развалу брыгады тав. Рачкова яскрава сьведчаць аб гэтым.

Фармальны падыход стварэньня брыгад

У лепшым выпадку гаспадарнікі і прафработнікі абмяжоўваюцца фармальным «стварэньнем» брыгад на паперы. Вось прыклад; месяць таму назад у Залесьсе зьявіўся прадстаўнік Гомельскай сплаўнай канторы Сычоў. Сычоў падышоў да вырашэньня сваёй задачы па казённаму: ён арганізаваў брыгады па вязцы, хоць ведаў, што заўтра палова сплаўшчыкоў адпраўляецца на іншыя работы. Зразумела справа абмяжавалася пратаколам аб стварэньні гэтых брыгад.

Але вось цяпер усе сплаўшчыкі ў зборы і працуюць па вязцы плытоў, а рабочым ня думае ўзьнімаць пытаньне аб брыгадным мэтадзе працы. Чачэрская сплаўкантора, як відаць, лічыць, што гэта наогул не яе справа.

На Сожска-Дняпроўскім басэйне, а таксама і на дзелянках Гомельскага Лесправгасу няма правільнага разьмеркаваньня заработнай платы знутры брыгад. Зьмест таго, каб кожны член брыгады атрымліваў адпаведна сваёй кваліфікацыі і прадукцыйнасьці, ужываецца ўраўнілаўка. Загадчык Веткаўскага Вучлесгасу т. Грэчачын, на запытаньне, як у брыгадах разьмяркоўваецца заработак, з гордасьцю адказаў: «Што ён гэтага ня ведае, што гэта справа не яго, а самой брыгады». І, аказваецца, што ў большасьці брыгад існуе ўраўнілаўка: заработак брыгады падзяляецца паміж усімі па роўну, без уліку кваліфікацыі і прадукцыйнасьці працы. Такая ўраўнілаўка выгадна толькі нашым клясавым ворагам, таму, што яна—верны шлях да развалу брыгады.

У гэтым Веткаўскім Вучлесгасе брыгады арганізоўваюцца без ўсякага кіраўніцтва з боку партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. У адну брыгаду падбіраюцца толькі моцныя і кваліфікаваныя лесарубы і сплаўшчыкі, а ў другую слабыя і мала кваліфікаваныя. Такім чынам, змазваецца адна з асноўных задач брыгаднага мэтаду—скарыстаньне працы падлётка, жанчын і не кваліфікаваных рабочых.

Прыклад з Старасельскай брыгадай і ўсё сказанае цалкам датычыцца і да ўсіх лесазагатоўчых і сплаўных вучасткаў Гомельскага раёну.

Мясцовыя работнікі ня толькі не жадаюць разумець гэтага, але яны нават ставяць сабе ў заслугу раўнялыную аплату ў брыгадзе, лічачы яе вялікім дасягненьнем. Такое «дасягненьне» выгадна толькі кулаком, якія скарыстоўваюць ураўнілаўку як адзін з мэтадаў развалу брыгады.

На прыстані Залесьсе яшчэ ў маі месяцы былі арганізаваны брыгады сплаўшчыкаў. Імі казыра е у сваіх справаздачах сплаўная кантора, але... да сёньняшняга дню гэтыя «брыгады» працуюць па старому. Залескія плытагоны члены прафсаюзу, дзе маецца і рабачком.

Стварыць брыгады возчыкаў

Аб стварэньні брыгад па вывазцы лесу няма нават і гутаркі. Паміж тым, практыкай даказана, што такія брыгады ўпаўне жыцьцёвы і неабходны, бо яны вызваляюць вялікую колькасьць рабочых рук. Чаму на самой справе за кожным канём ісьці возчыку, калі нават зімой у больш цяжкіх умовах возчыкі, арганізаваныя ў брыгаду, абслугоўвалі па 3—5 коняй кожны.

Ударны месячнік лесазагатовак і лет ні сплаў патрабуюць ня толькі прыцягненьня на работу тысячы новых людзей, але падвяцьця прадукцыйнасьці працы кожнага лесаруба, кожнага плытагона. Брыгада, сцэмантаваная ударніцтвам і сацыпаборніцтвам—найбольш дасканалая форма свабоднай сацыялістычнай працы, высунутая гас падарамі сваёй краіны—лесарубамі. Арганізуючыся ў брыгады, перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага, выкрываючы апартуністаў - перавыканаем заданьне ўдарнага месячніка лесазагатовак, лесавывазак і праграму лепшага лесасплаву.

М.

ПРЫЗЫЎНІК ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА

ПАВІНЕН БЫЦЬ ПІСЬМЕННЫМ

Арганізуем дапамогу камсамолу БССР у паходзе за пісьменнага прызыўніка

Чырвоная армія павінна атрымаць пісьменную зьмену

Дапаможам камсамолу БССР правесьці паход за пісьменнага байца

На аснове вялізарнейшых посьпехаў у справе сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, дасягнутых дзякуючы правільнаму ленінскаму кіраўніцтву на чале бальшавіцкае партыі і яе ЦК, правядзеню генэральнай лініі партыі: шпаркімі тэмпамі адбываецца аснашчэньне Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії сучаснай ваеннай тэхнікай.

Сучасная тэхніка Чырвонай армії і задачы баявой і палітычнай падрыхтоўкі РСЧА, на даным этапе яе будаўніцтва, прад'яўляюць падвышаныя патрабаваньні ў адносінах пісьменнасьці чырвоаармейскага складу. Баявая тэхніка Чырвонай армії патрабуе пісьменных, тэхнічна падрыхтаваных, палітычна сьвядомых і дысцыплінаваных байцоў, а гэтыя якасьці лепш за ўсё можна выхаваць у пісьменнага чырвоаармейца. Малапісьменнасьць і няпісьменнасьць ,асабліва ў сучасны момант зьяўляюцца значным тормазам у справе аўладаньня тэхнікай і пытаньнямі баявой і палітычнай падрыхтоўкі ў цэлым.

За апошнія гады Чырвоная армія атрымлівала ўсё больш і больш пісьменнае пакаленьне, процант няпісьменных у складзе прызыўнікоў з году ў год становіцца ўсё менш і менш. Аднак, яшчэ і ў складзе прызыву мінулага году ў Чырвоную армію прышла досыць значная колькасьць няпісьменных і вельмі вялікі процант малапісьменных чырвоаармейцаў.

Усё гэта гаворыць за тое, што існуючыя арганізацыі, якія трэба ведаць лік відацыяй няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў і пераменьнікаў ня ўсюды і не заўсёды зьвяртаюць належную ўвагу на гэтую работу, недастаткова энэргічна працуюць над тым, каб Чырвонай армії даць пісьменнае пакаленьне і тым самым яшчэ ў большай меры дапамагаць замацаваньню яе баявой магутнасьці.

Даныя, якія маюцца ў Паліткіраўніцтве акругі, аб становішчы работы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў па БССР [illegible] калі вобласьці гаворыць аб [illegible] работа па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў [illegible] на ўдарныя прызыўнікаў [illegible] сацыялістычнага спатэмпы і [illegible]рніцтва, дык і ў гэтым годзе Чырвоная армія і ў прыватнасьці Беларуская акруга атрымаюць яшчэ значны процант няпісьменных і яшчэ большую колькасьць малапісьменных прызыўнікоў, чаго ні ў якім разе ня можам дапусьціць. Чырвоная армія , бягучым—трэцім рашаючым годзе пяцігодкі павінна атрымаць пісьменную зьмену, гэтага патрабуюць інтарэсы умацаваньня яе баявой магутнасьці і абароназдольнасьці нашае краіны. Няпісьменны прызыўнік—дакор для арганізацый тых мясцовасьцяй ,адкуль ён прыдзе.

На днях Рэвваенсавет акругі зьвярнуўся да Цэнтральнага Камітэту камсамолу БССР, Абкому камсамолу Заходняй вобласьці і ўсіх камсамольскіх арганізацый Беларусі і Заходняй вобласьці з просьбай дапамагчы адпаведным арганізацыям ліквідаваць няпісьменнасьць сярод дапрызыўнікаў і забясьпечыць для Чырвонай армії пісьменнае пакаленьне. Часу да будучага прызыву ў Чырвоную армію засталося вельмі мала і задача ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў можа быць вырашана пры ўмове, калі ня толькі камсамол, але і партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і прамадзкія арганізацыі возьмуцца за гэтую работу па ўдарнаму ,калі ўся работа па ліквідацыі няпісьменнасьці будзе пастаўлена на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Камсамолу тут належыць пачэсная роля. Уся маса камсамольцаў, камсамольскі актыў усіх грамадзкіх арганізацый павінны безадкладна ўключыцца ў паход за ліквідацыю няпісьменнасьці сярод прызыўнікаў 3-га рашаючага году.

Абком камсамолу Заходняй вобласьці хутка падхапіў зварот РВС Акругі і намеціў практычныя мерапрыемствы па яго рэалізацыі. З 25 чэрвеня камсамол Заходняй вобласьці праводзіць ударны 3-х месячнік па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў, стварэньня брыгады для праверкі і арганізацыі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці, намечана ў бліжэйшыя дні па гарадох і сельсаветах правесьці нарады няпісьменных дапрызыўнікаў на прадмет арганізацыі іх для работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Штаб абласной культэстафеты ўжо 21 чэрвеня абгаварыў зварот РВС Акругі і намеціў практычныя мерапрыемствы па яго выкананьні.

ЦК ЛКСМБ у адказ на адозву абвясьціў усебеларускі паход за пісьменнага дапрызыўніка.

Будзем спадзявацца, што адпаведныя партыйныя, савецкія, прафэсыянальныя, прамадзкія арганізацыі дапаможуць камсамолу БССР сваім паходам работу па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў ,калі ўся работа па ліквідацыі няпісьменнасьці будзе пастаўлена на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Камсамолу тут належыць пачэсная роля. Уся маса камсамольцаў, камсамольскі актыў усіх грамадзкіх арганізацый павінны безадкладна ўключыцца ў паход за ліквідацыю няпісьменнасьці сярод прызыўнікаў 3-га рашаючага году.

Л. Хлусевіч.

Зборпераменьнікаў--сродак калектывізацыі

Маладыя байцы 1908-га году [illegible] Дзяржыня №-скага стралковага [illegible] палка прыбылі на 3-месячны збор [illegible] лягернай вучобы з вялізарным [illegible]язмам. Многа зараз сярод [illegible]ой калгасьнікаў, саўгас-рабочых, але многа яшчэ і ад паасобнікаў. Гэтая большасьць (аднаасобнікаў) [illegible] кожным днём памяншаецца, яны зрабіліся актыўнымі барацьбітамі за калгас. Прайшло 2 тыдні вучобы і добра зразумеўшы сутнасьць калгасу, байцы падаюць заявы аб прыёме ў калгас.

Гэты збор падрыхтуе барацьбітоў за генэральную лінію партыі і абаронцаў СССР.

Касьцяленя.

Нясупынны... сон

Нясупынна бязьдзейнічае ячэйка [illegible]авіяхіму саўгасвучу. За 8 месяцаў навучаньня ячэйкай нічога ня зроблена. Сакратар толькі тое і робіць, што зьбірае членскія ўзносы і... корміць нас абяцанкамі:

У гэтым ганебным становішчы ячэйкі вінаваты таксама партыйныя і камсамольскія ячэйкі профтэхшколы. Першая ня кіруе работай, а другая ня ўдзельнічае.

Брыгадзір «Сав. Бел».
Алесь Шпакоўскі.

МОЛ... БРЫГАД

Неадкладна прывесьці ў парадак сквэры і сады

Паскорыць будаўніцтва парку культуры і адпачынку

Паркі, сады і сквэры, якія зараз існуюць у Менску, не адпавядаюць задачам культурнага абслугоўваньня рабочых. Там можна ўбачыць кучы ня вывезенага пяску і рознага сьмецьця. Часта бываюць выпадкі, калі сквэры наогул ня ўбіраюцца. Апрача гэтага ў Менску сквэраў і садоў вельмі мала, асабліва ў прамысловых раёнах гораду.

Каб даць працоўным культурны адпачынак Гарсавет паставіў сваёй мэтай пабудаваць у гэтым годзе І новы сквэр у былым садзе друкароў і парк культуры і адпачынку і разам з гэтым прывесьці ў парадак існуючыя сады і сквэры.

Але-ж гэтая работа ідзе надта марудна. Гаркамгас лічыць будаўніцтвам тое, што пастаўлена 22 новых скамейкі, у садзе друкароў. Зараз работа ў сквэры зусім спынена. Кучы сьмецьця ня вывозяцца, яшчэ да гэтага часу ня зьняты непатрэбныя будынкі.

Гарадзкі сад быў вельмі разбураны паводкай, у выніку якой разьнесена галоўная алея, параскіданы масты, занесены пяском канавы і г. д. На рамонт саду адпушчана Гаркамгасам 15 тысяч рублёў, але гэтыя сродкі амаль не скарыстоўваюцца. На сёньняшні дзень ад рамантавана толькі адна алея і зараз будуецца новы мосьцік. Сьмецьце, якое ляжыць у кучах, яшчэ ня вывезена.

Штату працуючых уборшчыкаў і вартаўнікоў мала. Яго неабходна неадкладна папоўніць.

Культурнае абслугоўваньне зусім адсутнічае. Калі брыгада запытаецца, чаму няма ў гарадзкім садзе чытальні, дык у Гаркамгасе адказалі, што гэта ня парк культуры і адпачынку, а проста сквэр, таму і немэтазгодна адарываць там чытальню (?!). Гэты адказ яскрава сьведчыць аб тым, як Менгаркамгас «зацікаўлен» у наладжваньні культурнага адпачынку працоўных Менску.

Неабходна адзначыць як разгортваецца будаўніцтва новага парку культуры і адпачынку на Камароўцы. Гэтае будаўніцтва распачата 8 мая г.т., але і зараз у ім маецца вельмі нязначны зрух.

Па пляну на будаўніцтва парку асыгнавана 60 тыс. руб., а да гэтага часу скарыстана ўсяго 12 тыс. руб. Да часу адкрыцьця парку, 11 ліпеня, мяркуецца закончыць пабудову алеек, устанавіць 8 лаўкоў, перавесьці і ўстанавіць чытальню і правесьці сьвятло. Тут таксама адчуваецца цэлы рад недахопаў.

Разам з будаўніцтвам парку будуецца дом адпачынку «5-га дню ўдарнікаў».

У двухдзеяднік палепшаньня дабрабыту, які зараз праводзіцца, павінны быць ліквідаваны ўсе недахопы. Менгаркамгасу трэба прыняць рашучыя меры да таго, каб паскорыць будаўніцтва паркаў і сквэраў, своячасова забясьпечыўшы іх неабходнымі будаўнічымі матар'ялмі, і рабочай сілай.

Брыгада друку: Касабуцкая, Бяляева і Ладуцька Ц.

У пасёлку Імя Першага Мая

Пасёлак Імя 1-га мая налічвае 180 жыхароў. У сучасны момант на пасёлку будуюцца яшчэ 4 дамы стандартнага, тыпу, якія дадуць 34 кватэры.

Значным недахопам пасёлку зьяўляецца адсутнасьць пральні, ясьлей, дзіцячага саду, пляцоўкі для гульняў. Зімні дзіцячы сад зьмешчаны ў двух маленькіх пакойчыках, дзе ў вялікай цеснаце знаходзіцца 25 дзяцей. Санітарнае становішча пасёлку ў асноўным здавальняючае, за выключэньнем двух кватэр.

Ня гледзячы на тое, што пасёлак пераўнальна нядаўна пабудаваны, усё-ж у ім патрабуецца дробны рамонт. пячэй, афарбоўка падлогі, дзьвярэй, ваконных рам і г. д. Гэтага рамонту праўленьні ЖАКТ'аў чамусьці ня робяць.

[illegible] адзін д... значнага рамо... монтам затрудняец... трэбных матар'ялаў: ... частак, дрэва і г. д. Час... матар'ялу павінна паступаць у ... вым парадку, а частку можна было... узяць на мясцох,—лесаматар'ялы і інш.

Пры некаторых Жактах нават ёсьць запасныя вадаправодныя часткі і ў свой час Менгарсаветам была выдана пастанова аб узяцьці ад жактаў гэтых матар'ялаў і перадачы іх Эльводу, але ніводзін з Жактаў гэтага не зрабіў, а адміністрацыйныя і гаспадарчыя органы на гэта не зьвярнулі ніякай ўвагі. Такім чынам, пастанова Гарсавету і зараз ня выканана.

Вялікім тормазам у правядзеньні рамонтных работ вадаправоду і работ па каналізацыі зьяўляецца недахват рабочай сілы, асабліва чорнарабочых. Наркампрацы, які рэгулюе забесьпячэньне рабочай сілай, мала клапоціцца аб тым, каб забясьпечыць Эльвод належнай колькасьцю рабочых. На заяўкі Эльводу НКП даваў не рэальныя нарады ў такія раёны, дзе і так не хапае рабочай сілы. Усё гэта перашкаджае нармальнай рабоце Эльводу. У выніку гэтага бываюць частыя перабоі з падачай вады, яшчэ зусім недастаткова нагружана каналізацыйная сетка (75 проц. сеткі не нагружана).

Эльвод мае так званыя «палі фільтрацыі». Гэта вучастак зямлі, які абвадняецца і ўнойваецца афільтраванымі пячыстотамі выкіданымі каналізацыйнай сеткай. На гэтых палёх робяцца засевы.

На тэрыторыі палёў фільтрацыі зараз жывуць яшчэ тры хутаршчыкі. Гэтыя грамадзяне вельмі шкодзяць рабоце на палёх. Яны зьнішчаюць пасевы, заводзяць бойкі і лаянку з рабочымі, а ўзімку яны высеклі дрэвы пасаджаюць ніж...

Значнай пера... праводу зьяўляецца неэка... шы раз і проста злачынная трата вады яе спажыўцамі. Паводле падлікаў Эльводу на аднаго спажыўца ў дамох уключаных у каналізацыйную сетку траціцца ў сярэднім каля 75 літраў вады ў дзень, а ў дамох няўключаных у каналізацыйную сетку 35—50 літраў на кожнага чалавека.

Вада з вадаправодных калёнак, якія ўстаноўлены на акраінах траціцца вельмі неэканомна. Часта пад вадаправоднымі калёнамі жанчыны мыюць бялізну, карыстаючыся пры гэтым бесьперапынным струменем вады.

Гэта вельмі адбіваецца на забесьпячэньні гораду вадой, тым больш, што шчыліны паступова пачынаюць бяднець на ваду.

За такое барбарскае зьнішчэньне вады на паасобных грамадзян накладаліся штрафы, аднак, яны не спаганяліся і вада па гэты час выдаткоўваецца зусім неэканомна.

Усё гэта перашкаджае нармальнай рабоце вадаправоду. А перабоі ў забесьпячэньні матар'ялам і рабочай сілай, што атрымліваюцца ў выніку цяганіны паміж камгасам, Дзяржснабам і некаторымі іншымі гаспадарчымі арганізацыямі, проста ставяць пад пагрозу зрыву работы па рамонту вадаправода і далейшых работ па каналізацыі і патрабуюць умяшаньня пракуратуры.

Брыгада друку: Шпорына, Кляскоў, Курчыхіна і Пакроўскі.

Вакол пабудоў нічога ня зроблена для сьцёку вады. Двары не расплянаваны. Культработа не праводзіцца. Чырвоных куткоў, або клюба няма. Праўленьне пасёлку тлумачыць гэта адсутнасьцю памяшканьня.

Зялёных насаджэньняў як вакол пасёлку, так і ў самым пасёлку імя 1-га мая няма. Толькі ў мінулым годзе прыступлена да пасадкі маладых дрэў, за якімі, аднак, таксама няма належнага нагляду.

Мы лічым, што праўленьне пасёлку безадкладна ўжыве ўсе залежныя ад яго меры, каб скончыць будаўніцтва гэтых чатырох дамоў у тэрмін, зро... біць неабходны дробны рамонт, к... хаваць памяшканьні ад разбуч... Возьмецца за культработу, ар... дзіцячы сад або пляцоўку, уц... больш грамадзкасьць жыхароў па... сёлку ў сваю работу з тым, каб не дапускаць ніякіх недахопаў, каб лепш наладзіць культуру і быт рабочага да... нага пасёлку.

Брыгада друку Дзьмітровіч, Дубен, Сайкоўскі, Жукаў.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 3 № 147 (3236)

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Па дакладу Наркамфіну аб ужытых мерапрыемствах па арганізацыі і узмацненьні сельскіх бюджэтаў

Заслухаўшы даклад Народнага камісара фінансаў БССР тав. **А. І. Хацкевіча** аб ўжытых мерапрыемствах па арганізацыі і ўзмацненьні сельскіх бюджэтаў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

1. Адзначыць, што ў выкананьне пастановы III-й Сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня з 1-га студзеня 1931 году ва ўсіх сельскіх саветах уведзены самастойныя сельскія бюджэты з адпаведнай фінансавай базай.

2. На бюджэты сельсаветаў перададзены ўсе ўстановы і мерапрыемствы сельскага значэньня, знаходзячыяся на тэрыторыі сельсаветаў, а па некаторых раёнах, нават, установы, якія маюць міжпасялішчнае значэньне, як на прыклад, школы сямігодкі, больніцы і інш.

3. Сельсаветам перададзены ўсе непадатковыя даходныя крыніцы сельскага значэньня і вызначан процант ад сельскіх падатковых даходаў, пры чым у шмат выпадках падатковыя даходы (сельгаспадатак і культзбор) перададзены поўнасьцю.

Побач з адзначанымі станоўчымі вынікамі ў справе масавага вядзеньня сельскіх бюджэтаў, Прэзыдыум ЦВК адзначае наступныя недахопы:

1. Сельскія саветы да гэтага часу не скарыстоўваюць свой мясцовы бюджэт як магутны фактар для ўцягненьня ў работу сельскіх саветаў савецкай грамадзкасьці вёскі, рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і вясковай беднаты. Складаньне і выкананьне бюджэтаў праходзіць часта бяз удзелу вясковай грамадзкасьці.

2. Сельскія рэвізійныя камісіі слаба праяўляюць сваю дзейнасьць у сэнсе кантролю за выкананьнем сельскага бюджэту як па даходах гэтак і па расходах, не ўцягнута ў рэвізійную справу савецкая грамадзкасьць і не практыкуецца справаздачных дакладаў рэвізійных камісій на агульных сходах.

3. Па сельскаму бюджэту не наладжана бухгальтарская справаздачнасьць і не заўсёды захоўваецца бюджэтная і касавая дысцыпліна.

4. З боку райвыканкомаў і Наркамфіну недастаткова праводзіцца інструкцыйная работа ў сэнсе асваеньня сельсаветамі сваіх бюджэтных правоў, захаваньня бюджэтнай і касавай дысцыпліны і своечасовага вядзеньня вучоту і справаздачнасьці.

У мэтах узмацненьня дзейнасьці сельсаветаў у галіне складаньня і выкананьня бюджэтаў і для ператварэньня сельскіх бюджэтаў і сапраўдны фактар гаспадарчага і культурнага ўздыму вёскі, Прэзыдыум ЦВК прапануе:

1. Сельсаветам забясьпечыць шырокі ўдзел савецкай грамадзкасьці вёскі, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бедняцка-сярэдняцкіх мас у рабоце па складаньні і выкананьні сельскіх бюджэтаў, а таксама кантролю за іх выкананьнем, ставячы на абгаварэньне сходаў даклады аб выніках складаньня і выкананьня бюджэту.

2. Райвыканкомам ажывіць дзейнасьць сельскіх рэвізійных камісій ў частцы нагляду за правільным і мэтазгодным выдаткаваньнем сельсаветамі бюджэтных сродкаў, за захаваньнем імі бюджэтнай і касавай дысцыпліны і за своечасовым правядзеньнем у жыцьцё прадугледжаных па бюджэце будаўніцтва і іншых мерапрыемстваў.

3. Райвыканкомам і Наркамфіну ўзмацніць інструктаваньне сельскіх саветаў у справе асваеньня імі сваіх бюджэтных правоў, вывучэньня парадку складаньня і выкананьня бюджэтаў і наладжваньня справаздачнасьці.

4. Выходзячы з неабходнасьці ажыцьцяўленьня існуючых пастаноў аб арганізацыі апчадкас пры ўсіх сельскіх саветах, дзякуючы чаму пры перадачы выкананьня бюджэту ашчадкасаў пры сельсавеце, гэта выкананьне значна паляпшаецца, перадаць часова выкананьне сельскіх бюджэтаў, там дзе няма ашчаднай касы ў межах сельсавету, бліжэйшай ашчаднай касе. Наркамфіну і Дзяржбанку ў месячны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для правядзеньня гэтага мерапрыемства ў жыцьцё і даць адпаведныя паказаньні раёнам.

5. Наркамфіну, НК РСІ і Аргінстру Прэзыдыуму ЦВК правесьці агляд фактычнага становішча сельскіх бюджэтаў шляхам выбарачнага іх абсьледваньня.

Вынікі агляду сельскіх бюджэтаў дакладзіць Прэзыдыуму ЦВК да 1-га кастрычніка.

6. Па сканчэньні бюджэтнага 1931 г. райвыканкомам падаць у Прэзыдыум ЦВК праз Наркамфін даклады аб выніках існаваньня самастойных сельскіх бюджэтаў, а таксама аб выніках бюджэтнай кампаніі па сельскіх бюджэтах на 1932 г.

Заслухаць у лютым месяцы 1932 г. даклад Наркамфіну аб сельскіх бюджэтах.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

15 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра ахову лясоў ад пажараў

У адпаведнасьці з пастановай Савету Народных Камісараў СССР за 14 мая 1931 г. «Пра ахову лясоў ад пажараў», Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Агульны кантроль і кіраваньне аховай лясоў ад пажараў усклясьці на Лесбел.

2. Беспасрэднае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па ахове лясоў ад пажараў усклясьці на наступныя органы:

а) у лясох дзяржаўнага значэньня на леспрамгасы і вучлесгасы Лесбелу;

б) у лясох мясцовага значэньня—на сяльскія сельскія саветы і раённа-гаспадарчыя камітэты.

Лесбелу і леспрамгасам і вучлесгасам права ўскладаць правядзеньне супроцьпажарных мерапрыемстваў на непадпараднаваных ім прыватнікаў і лесазагатоўшчыкаў наступных выпадках:

а) пры перадачы лесных вучасткаў для лесазагатовак;

б) пры перадачы вучасткаў пад падсочку для здабываньня жывіцы;

в) пры перадачы вучасткаў пад смалакурэньне, здабываньне карчоў і для іншых карыстаньняў, зьвязаных з эксплёатацыяй драўніны;

г) пры перадачы лесных вучасткаў пад пабочныя карыстаньні.

Разьмер і характар супроцьпажарных мерапрыемстваў, а таксама парадак выкананьня гэтых мерапрыемстваў устанаўляецца дагаворамі з паказанымі лесакарыстальнікамі і лесазагатоўшчыкамі.

4. Для правядзеньня супроцьпажарных мерапрыемстваў і тушэньня лясных пажараў адказныя за ахову лясоў органы (Лесбел, леспрамгасы, вучлесгасы, сельскія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты) маюць права скарыстоўваць:

а) тэхнічныя сродкі сувязі Народнага Камісарыяту Шляхоў, Народнага Камісарыяту Воднага Транспарту і Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфу;

б) агульную тэлефонную сець чыгунак для ўключэньня ў яе на летнія месяцы па ўзгадненьню з органамі НКШЗ сваёй тэлефоннай сеці.

5. Тушэньне лясных пажараў, якія па сваіх разьмерах ня могуць быць ліквідаваны сіламі лесагаспадарчых арганізацый, пажарных дружын і камандаў і іншых лесакарыстальнікаў і лесазагатоўшчыкаў, абавязаных па падставе дагавораў праводзіць супроцьпажарныя мерапрыемствы, укладаецца на сельскія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты.

Для гэтай мэты сельскім саветам і раённым выканаўчым камітэтам надаецца права:

а) скарыстоўваць апроч сродкаў сувязі (згодна арт. 4) рухавы склад чыгунацкага і воднага транспарту для перавозкі на месца пажару і назад рабочай сілы і пажарнага інвэнтара, пры чым параходы прадстаўляюцца на адлегласьць да 20 кілёмэтраў;

б) скарыстоўваць пажарны інвэнтар, абслугоўваючы яго пэрсанал і транспартныя сродкі ўсіх дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, грамадзкіх і кааперацыйных арганізацый і прыватных асоб і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на данай тэрыторыі. Ім павінна пакідацца на месцы такая колькасьць людзей і інвэнтара, якая патрэбна для аховы будынкаў, і прадпрыемстваў;

в) вызываць вайсковыя часьці, якія распаложаны на данай тэрыторыі. Выдаваць вайсковых часьцей для тушэньня лясных пажараў робіцца ў парадку, прадугледжаным пастановай СНК Саюзу ССР за 17 кастрычніка 1925 г. «Пра садзейнічаньне войск мясцовым органам ўлады»;

г) прыцягваць да тушэньня пажараў мясцовае насельніцтва, прычым у выпадку прыцягненьня насельніцтва, якое жыве далей 5-ці кілёмэтраў ад месца пажараў, сельскі савет павінен абавязкова паведаміць аб гэтым у той самы дзень раённы выканаўчы камітэт;

6. Пажарны інвэнтар, рухавы склад транспарту і сродкі сувязі (арт. арт. 4 і 5) адпаведныя дзяржаўныя і кааперацыйныя органы, грамадзкія арганізацыі і прыватныя асобы абавязаны прадстаўляць ва ўсіх выпадках тушэньня пажараў бесплатна.

Карыстаньне тэхнічным сродкамі сувязі ва ўсіх выпадках робіцца ўне чаргі.

Калі лясны пажар мае характэр навальнай бядоты і ня можа быць ліквідавай сіламі і сродкамі лесагаспадарчых арганізацый, пажарных дружын і камандаў, то праца прыцягнутага для тушэньня яго мясцовага насельніцтва як беспасрэдна зацікаўленага ў перасьцярозе ці ў ліквідацыі навальнай бядоты паводле пастановы раённага выканаўчага камітэту не аплачваецца.

7. Забараніць раскладваць у лясох агонь ў час з 1-га мая да 1-га кастрычніка, а таксама ўжываньне ў гэты час паляўнічымі клакоў (пыжоў) з успламяняючыхся матарыялаў.

8. Па ўзьнікненьні лясных пажараў органы дазнаньня павінны бездакладна рабіць расьледваньне прычын іх узьнікненьня для прыцягненьня да адказнасьці непасрэдна вінаватых асоб і асоб, якія не ўжылі патрэбных захадаў да папярэджаньня і тушэньня пажараў.

Матарыялы расьледваньня павінны тэрмінова накіроўвацца ў судова-сьледчыя органы і апошнімі разглядацца ў тэрміновым парадку.

9. Прапанаваць лесагаспадарчым арганізацыям штогод вызначаць ў лясох месцы найбольш небясьпечныя ў адно сінах пажараў і забараніць на іх ў засушлівы пэрыяд пасьбу жывёлы і іншыя віды пабочных карыстаньняў, а таксама ўстанаўляць штогод на засушлівы пэрыяд спэцыяльную пажарную варту.

10. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам па ўзгадненьні з лесагаспадарчымі арганізацыямі разьмеркаваць лясную плошчу паміж прылягаючымі паселішчамі для ажыцьцяўленьня апошнімі мерапрыемстваў па папярэджаньні лясных пажараў і мажліва—хутчэйшага і арганізаванага правядзеньня мабілізацыі па сельніцтва ў выпадку ўзьнікненьня іх.

11. Даручыць Ўпаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхаў Зносін пры СНК БССР ужыць захады да таго, каб у мясцох пэласы адчуджэньня чыгуначных шляхоў, якія прылягаюць да лясных масываў своечасова рабілася ачыстка ад лёгкаўспламяняючагася хлама, а таксама каб па ўсіх цягніках маршрутнага сьледваньня ў летні час устанаўліваліся іскрагасіцелі.

12. Абавязаць лесагаспадарчыя арганізацыі штогод не пазьней 15 мая правесьці ачыстку лесу ад хламу і месц рубак ад астач загатовак. У выпадках адтэрмінаваньня загатовак і вывазкі гэтая ачыстка павінна быць таксама своечасова зроблена да высыханьня хлама і астач.

13. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты ў разьвіцьцё гэтай пастановы выдаваць своечасова абавязковыя пастановы пра ахову лясоў ад пажараў з улікам усіх асаблівасьцяў раёну.

14. Скасаваць пастанову СНК БССР за 22 мая 1925 г. «Пра меры папярэджаньня і тушэньня лясных пажараў». (З. З. БССР № 27, 1925 г. арт. 236).

Нам: Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

23 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

У КАМІСІІ ВЫКАНАНЬНЯ

Пастанова Камісіі выкананьня пры СНК БССР

Пра выкананьне прадпрыемствамі ВСНГ БССР ды рэктыў партыі і ўраду пра эканомію апалу

Выслухаўшы даклад прадстаўніка ВСНГ БССР тав. Ноіма і садаклад прадстаўніка НК РСІ БССР тав. Самахвалава, Камісія Выкананьня ўстанаўляе:

1. Дырэктывы ЦК КП(б)Б ад 1-II—1931 г. і СНК БССР аб барацьбе з перапалам паліва і правядзеньні ў выдаткаваньні паліва 15 проц. эканоміі большасьцю прадпрыемстваў ВСНГ ня выканана, а па шэрагу аб'яднаньняў і прадпрыемстваў (Шклоаб'яднань не, Тэкстыльаб'яднаньне і інш.) ёсьць вялікія перапалы паліва.

2. Пры гэтым Камісія Выкананьня адзначае, што:

а) ВСНГ, прамаб'яднаньні і паасобныя прадпрыемствы да гэтага часу не наладзілі даскачалага колькаснага і якаснага падліку паліва, што не дае магчымасьці сапраўды высьвятліць наяўнасьць перапалу, ці эканомі апалу;

б) у апараце ВСНГ і яго аб'яднаньнях, а таксама на прадпрыемствах ня вылучаны асобы, якія павінны адказваць за эканомію паліва;

в) у большасьці аб'яднаньняў і прадпрыемстваў не распрацаваны пляны канкрэтных мерапрыемстваў для зьніжэньня выдаткаваньня апалу і энэргіі;

г) інстытут Прамысловасьці БССР зусім недастаткова разгарнуў работу па рэалізацыі энэргагаспадаркі БССР;

д) гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі, а таксама і друк недастаткова мабілізавалі грамадзкую думку рабочай масы навакол барацьбы за правядзеньне эканомі апалу ў прамысловасьці, на транспарце і ў дамавым апаленьні;

е) па большасьці прадпрыемстваў ня створаны энэргагаўчэйкі, а там, дзе такія ёсьць яны зусім слаба працуюць.

Выходзячы з паказанага Камісія Выкананьня пастанаўляе:

1. Абавязаць ВСНГ пад адказнасьць т. Ноіма ў 5-ці дзённы тэрмін распрацаваць нормы выдаткаваньня апалу (дроў, торфу, вугалю) і не пазьней 10 ліпеня давесьці да кожнага прадпрыемства плянавае заданьне выдаткаваньня апалу і энэргіі на адзінку натуральнай прадукцыі для 3-га і 4-га кварталаў 1931 г.

2. Прапанаваць кіраўнікам аб'яднаньняў і дырэктарам прадпрыемстваў пад іх асабістую адказнасьць, на працягу 5-ці дзён:—

а) наладзіць на прадпрыемствах дасканалы падлік пераходзячых астач апалу, а таксама спрошчаны падлік якасьці яго (вільготнасьць дроў і торфу, зольнасьць вугалю);

б) вылучыць у апаратах аб'яднаньняў і на прадпрыемствах адказных за эканомію апалу, асоб, на якіх усклясьці таксама адказнасьць за своечасовае прадстаўленьне ў ВСНГ штомесячных справаздач аб выдаткаваньні апалу і энэргіі і якасьці спажытага апалу.

3. Абавязаць прамаб'яднаньні ВСНГ пад асабістую адказнасьць іх кіраўнікоў:

а) не пазьней 15 ліпеня скласьці з удзелам інстытуту Прамысловасьці ВСНГ, па кожным аб'яднаньні пляны канкрэтных мерапрыемстваў па рацыяналізацыі і зьніжэньні выдаткаваньня апалу і энэргіі;

б) ужыць захады да таго, каб не пазьней 15 ліпеня г. г. усе прадпрыемствы атрымалі зацьверджаныя палажэньні аб парадку прэміраваньня за эканомію апалу і неадкладна прыступілі да ажыцьцяўленьня гэтага прэміраваньня.

4. Прапанаваць ВСНГБ пад адказнасьць т. Валасевіча ужыць неадкладна захады, якія забясьпечваюць падрыхтоўку і перападрыхтоўку качагараў, асабліва на тых прадпрыемствах, якія зьяўляюцца буйнымі спажыўцамі апалу.

5. Прапанаваць ВСНГ, пад адказнасьць т. Валасевіча, і дырэктару Інстытуту Прамысловасьці т. Слоніму не адкладна даўкамплектаваць энэргаадзел Інстытуту Прамысловасьці адпаведнымі тэхнічнымі кадрамі, з тым, каб ператварыць яго ў сапраўдны орган рацыяналізацыі энэргагаспадаркі БССР.

6. Даручыць ВСНГ, пад адказнасьць тав. Ноіма:

а) ужыць неадкладна захады да перабудовы топак на прадпрыемствах у мэтах хутчэйшага пераводу прамысловасьці на апал кавалкавым і фрэзарным торфам, прадуглядзеўшы пры гэтым максымальную эканомію яго выдаткаваньня;

б) забясьпечыць прадпрыемствы адпаведнымі вымеральнымі прыборамі, поўнасьцю скарыстоўваючы маючыяся ўжо прыборы на прадпрыемствах.

7. Прапанаваць Энэргакамітэту БССР разам з ЦСПСБ неадкладна наладзіць сыстматычнае інструктаваньне энэргачэйак на прадпрыемствах і стварыць гэткія там, дзе іх няма.

8. Папярэдзіць усіх кіраўнікоў аб'яднаньняў, дырэктароў прадпрыемстваў і вылучаных адказных асоб па эканомі апалу аб абавязковым выкананьні дырэктыў партыі і Ўраду пра 15 проц. эканоміі апалу.

9. Прапанаваць ВСНГ у далейшым не адпускаць прадпрыемствам апалу звыш устаноўленых норм па пляну і прыцягваць да судовай адказнасьці асоб вінаватых у перажогу апалу.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **А. Калін.**

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

21 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР

Пра ход работы па рэалізацыі вынаходніцтва бульбянага камбайна тав. Казлоўскага

Выслухаўшы інфармацыю прадстаўніка ВСНГ тав. Русановіч і Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага пра ход работы па канструкцыйнаму афармленьню і складаньню рабочых рысункаў бульбянага камбайна вынаходніцтва тав. Казлоўскага Камісія Выкананьня пры СНК БССР лічыць устаноўленым, што пастанова Савету Народных Камісараў БССР за 13 студзеня 1931 г. (прат. № 74 п. 3640, разьдзел 11) ня выканана.

Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі БССР ня былі ўжыты ўсе захады да хутчэйшага складаньня рабочых рысункаў (працуе толькі адзін канструктар) і сама работа вядзецца такімі тэмпамі, якія не забясьпечваюць выпуску камбайну да пачатку ўборачнае кампаніі.

Выходзячы з гэтага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:** прапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР, пад адказнасьць т. т. Русановіч і Арлоўскага, бездакладна забясьпечыць выкананьне рабочых рысункаў камбайну праз выдзяленьне патрэбнай колькасьці спэцыялістых і чарцёжнікаў з тым, каб бульбяны камбайн быў выпушчан да пачатку ўборкі бульбы.

Прапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР далажыць на наступным пасяджэньні камісіі выкананьня, якія канкрэтна ўжыты імі захады да забясьпечаньня выкананьня гэтае пастановы.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **А. Калін.**

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

21 чэрвеня 1931 г.
гор. Менск.

Па гарадох і раёнах

Калгас імя Крупскай, Менскага прыгараднага сельсавету, скончыўшы вясновую сяўбу, падпісаўся на пазыку «3-га рашаючага» на 2000 руб., што складае 160 проц. месячнага даходу і выклікаў на сацспаборніцтва калгас «Адраджэньне» Менскага прыгараднага сельсавету.

А. С.

Працаўнікі чырвона-лускага нучлеспрамгасу падпісаліся на пазыку «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі» на 100 проц. месячнага заработку і выклікалі на сацспаборніцтва працаўнікоў Чарэйскага і Барысаўскага леспрамгасаў.

С. К.

За 50-тысячны тыраж газ. „Савецкая Беларусь“

Усім райкомам КП(б)Б, РК ЛКСМБ, ЮП, райпрафсаветам, райкалгассаюзам, калгасам, хатам-чытальням, школам, вайсковым аб'яднаньням, райаддзелам сувязі, сельпстаносцам, заг. аг-вамі і рабселькорам

Для пасьпяховага заканчэньня паўгодзьдзя падпісной кампаніі і правядзімага ЦК КП(б)Б месячніка друку па БССР, Культпром ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, Культсэктар ЦСПСБ, Газэтна-паштовы сэктар БУС'у і рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь», зварочваюцца да ўсіх культармейцаў-сельлістаносцаў, заг. агэнцтвамі гарадзкім лістаносцам, газэтаносцам, кіёскерам Саюздруку, распаўсюджваючым партыйна-камсамольскі і савецкі друк ў БССР з заклікам ўключыцца ва Ўсебеларускі 10-ці дзённы штурм прарыву ў тыражы газэты «Савецкая Беларусь».

З 1-VII г. г. па ініцыятыве Газэтна-паштовага сэктара БУС'у і са згоды рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь», кожнаму газэтна-паштоваму абменнаму пункту ўсіх раёнаў БССР па колькасьці ў газвузьле, або абменным пункце лістаносцаў і заг. агэнцтвамі будзе дадаткова выслана па 2 экз. газэты на кожнага лістаносца і загадчыка агэнцтвам для распаўсюджваньня шляхам звыш кантрольнай дадатковай поўгадавой, 3-х месячнай, або хоць месячнай падпіскі своечасова не падпісаўшымся чытачом.

Заклікаем усе РК КП(б)Б, прафарганізацыі, РК ЛКСМБ і камсамольскія ячэйкі, бюро ЮП, рабселькораў і грамадзкіх упаўнаважаных па распаўсюджваньні друку прыняць самы актыўны ўдзел ў дадатковай рэалізацыі падпіскай невыкананага па БССР тыражу газэты «Сав. Бел.». Заклікаем шляхам ударніцтва і спаборніцтва перавыканаць гэтыя дадатковыя тыражныя заданьні, шырока разгарнуўшы разам з працягнутай падпіскай і розьнічны продаж ўсіх, (як на белмове, так і на мовах нацменшасьцяй), выданьняў па пэрыодыцы ў саўгасах, калгасах, МТС, нова-пабудовах, школах, вайсковых і піянэрскіх лягерах, дачах, дамох адпачынку, сярод працоўнага сялянства і г. д.

Выклікайце на сацспаборніцтва суседнія р. прадпрыемствы, установы, арганізацыі, адзін аднаго і перасылайце сталыя заказы тэлеграфна праз пошту Менскаму Газбюро на патрэбныя для розьніцы выданьні.

Усім раённым, шматтыражным ФЗ і калгасна-саўгасным газэтам перадрукаваць гэтую адозву, ўключыўшы ў яе і свае выданьні.

Культпроп ЦК КП(б)Б Рычкоў, ЦК ЛКСМБ Перлін, Культсэктар ЦСПСБ Клімковіч, Камітэт па справах друку Пры СНК БССР Меляшкевіч, Газэтна-паштовы сэктар БУС'у і рэд. газ. «Сав. Бел.» Анташэўскі.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

5-ты выпуск курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ

29 чэрвеня адбудзецца 5-ы выпуск курсаў па падрыхтоўцы рабочых ў ВНУ пры БДУ. Адначасова курсы сьвяткуюць 3-х годзьдзе свайго існаваньня. Усяго курсамі за 3 гады падрыхтована 340 чалавек.

Курсы арганізаваны Пэдфакам БДУ і абслугоўваліся ўвесь час студэнтамі на грамадзкіх пачатках. За гэты навучальны год курсы падрыхтавалі 101 рабочага непасрэдна ад вытворчасьці, з якіх у зімовы і веснавы набор БДУ ужо было перададзена 57 чел. і сёньня выпускаецца 44 чал...

М. Рашчэня, М. Пражмо:

Зьлёт лёнаводаў-калгасьнікаў

Віцебск 28-6 (Белта). На 1-га ліпеня ў Віцебску Бекалгасцэнтр склікае ўсебеларускі зьлёт калгасьнікаў - ўдарнікаў лёнаводных раёнаў БССР. У зьлёце прымуць удзел 300 дэлегатаў. Зьлёт падвядзе вынікі сяўбы і абгаворыць правядзеньне ўборкі.

Ці ня шкодніцтва гэта?

Бабруйск 28-6 (Белта). Пабудова гарадзкога тэатру, куды ўкладзены сотні тысяч руб. у бягучым годзе павінна быць скончана. Але сёньняшнія тэмпы яго пабудовы надзвычайна марудныя і можна пэўна сказаць, што ў 1931 г. тэатр пабудаваны ня будзе.

У праектаваньні і самым будаўніцтва тэатру мае месца яўнае шкодніцтва. Глыбіня сцэны недастатковая, не прадугледжаны пад'ездны шлях для падвозу дэкарацый, плянам будаўніцтва нават не прадугледжана курыцельнага пакою і не ўстаноўлена паравога ацяпленьня. Пры тэатры няма памяшканьняў для майстэрняў. Памяшканьне для касьцюмернай пабудавана вельмі малое, прыбіральная разьлічана толькі на некалькі асоб.

Прадстаўнікі яўрэйскага Беларускага Дзяржаўнага тэатру, якія азнаёміліся з пабудоваю тэатру, цьвёрда заяўляюць, што пры такім плянаваньні тэатр не будзе адпаведаць ўмовам работы Дзяржаўных тэатраў і патрабуе значнага перабудаваньня, пераабсталяваньня і дабудовы ряду памяшканьняў.

Гэтыя зьмены ў будаўніцтва патрэбна ўнесьці зараз-жа.

Зрываюць збор утыльсы равіны

Мазыр. 24-VI (Белта). Збор утыльсыравіны па раёне на працягу ўсіх трох кварталаў сарваны. Выканана ўсяго 50 проц. пляну. Райпрамсаюз не зьвяртае ўвагі на ход збору ўтыльсыравіны. Заданьне выканана на 13 проц., Райкаапсаюз заданьне па зборы ўтыльсыравіны выканаў на 8 проц. Белутыль заданьне выканаў на 16 проц.

У Ельскім раёне зноў падняла галаву кулацкая зграя

ЕЛЬСК. (Наш. кар.). 21 чэрвеня 1931 году ў в. Княжабор'е адбыўся агульны сход актыву вёскі па пытаньні аб выкрыцьці кулакоў. На гэтым сходзе выступіла адна з актыўнейшых дэлегатак член КП(б)Б т. Данільчанка, якая ў сваім выступленьні выкрывала новых кулакоў.

Пасьля сходу, калі Данільчынка шла дадому, з-за вгула школы, дзе адбыўся сход, выскачыла група кулакоў і падкулачнікаў, якія абкружылі Данільчанка і сталі пляваць ёй ў вочы. Група складалася пераважна з жанчын—сваякоў высланых кулакоў і намечаных да індывідуальнага абкладаньня. Пасьля гэтага дачка кулака Бараноўская Ганна схапіла Данільчанка за галаву і пачала душыць, а астатнія кулакі Барабенка Кацярына, Стоцкая Александра, Бараноўскі Хома, Духноўская Марына абкружыўшы актывістку Данільчанка пачалі ірваць і шчыпаць яе.

На крык Данільчанкі прыбеглі калгасьнікі, якія ледзь вырвалі яе з рук азьвярэўшых кулакоў.

Бядната вёскі Княжабор'я патрабуе бязьлітасна пакараць кулацкую граю за напад на застрэльшчыцу калектывізацыі, і аднаго з лепшых барацьбітоў супроць кулацтва т. Данільчанка.

Герасіменка.

Група нямецкіх рабочых прыехала на курорты СССР

Негарэлае. 24-VI (Белта). 22-га чэрвеня праехала група хворых нямецкіх рабочых, якія накіраваны для лячэньня на паўднёвыя курорты СССР, у складзе 48 чалавек. У ліку хворых акрамя рабочых ёсьць—5 хатніх гаспадынь (жонкі рабочых), 1 саматужнік, 2—служачых, рэдактар камуністычнай газэты, 2 партработнікі, 1 чырвоная сястра. Сярод рабочых—значная частка беспрацоўных. Адзін з нямецкіх таварышоў сказаў кароткую прамову, у якой ад імя нямецкіх рабочых перадаў прывітаньне пралетарам СССР пераможна будуючым сацыялізм і заявіў, што яны шчасьлівы тым, што знаходзяцца ў свабоднай адзінай краіне ў сьвеце, дзе працоўным належыць усё і ў прыватнасьці курорты, на якіх маюць магчымасьць лячыцца працоўныя ўсяго сьвету.

ВЫКЛІК

Агульны сход супрацоўнікаў ЦВК БССР ад 9-VI 1931 г. пастанавіў адлічыць ½ проц. месячнага заробку ў непарушны фонд імя Леніна, (якія ўжо ўнесены) і выклікае супрацоўнікаў наступных ўстаноў зрабіць адлічэньні: СНК, ВСНГ, НКФ, НКЮ, Дзяржплян, НКПрацы і працаўнікоў газэты «Савецкая Беларусь».

Мясцком ЦВК БССР.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Для абгаварэньня пытаньня аб структуры райвыканкомаў і саветаў ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, Аргінстр Прэзыдыуму ЦВК БССР на 12 гадзін дня 30-га чэрвеня г. г. у памяшканьні ЦВК (Заля пасяджэньняў) склікае пашыраную нараду Аргінстру з удзелам прадстаўнікоў наступных устаноў: БДУ, БАН, Камвузу, СНК, НКРСІ, НКФ, НКЗ, Дзяржпляну, НКА, НКГандлю, Гарсавету, прыгараднага сельсавету, Галоўкіраўніцтва Ашчадкасамі, Калгасцэнтру, НКЮ, НКАЗ і газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Калгасьнік Беларусі», «Акцябр», Орка»; «Чырвоная Зьмена і «Рабочий».

Просьба да ўсіх пералічаных ўстаноў вылучыць сваіх прадстаўнікоў і к паказанаму тэрміну камандыраваць у ЦВК.

АРГІНСТР.

ДОМ АСЬВЕТЫ

— 30-6—31 г., а 7 гадз. ўвечары ў Доме-Асьветы адбудзецца сход работнікаў ФЗВ, Шумп і саўгасвучаў.

1. Даклад з месц.
2. Выбары на Ўсебеларускую канфэрэнцыю.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Вытворчы сэктар Гарпраўленьня Саюзу працасьветы сумесна з Горінспэктурай склікае на 30-VI г. г., а 5 гадзіне ўвечары ў Доме асьветы нараду па ўкамплектаваньні школ настаўніцтвам г. Менску.

Запрашаюцца заг. школ і ўсе зацікаўленыя настаўнікі.

ПЭДГАБІНЭТ.

30-VI г. г. у 19 гадзін—нарада загадчыкаў ФЗВ і вяч. раб. школ. Вынікі камплектаваньне школ настаўнікамі, рамонт школ і рознае.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр — 2-га ліпеня 1-я гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. ВОЎКАВА **АІДА** музыка Вэрдзі. Білеты ў раб. касе з 12-2 і 4-6 г. У касе тэатру з 12-21 з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — Сёньня і штодзённа. Гастролі лепшых у СССР. Вэлёсыпедыстаў—фігурыстаў ПОЛЬДЗІ. Нямецкі атракцыён 6—РЭДАМ—6 група гладзіятараў Самалёты на жывым п'едэстале. 5—ТОРНЭО—5 турысты на амэрык. трампліне. Два Сержэ—ікарыйскія гульні. Пачат. а 8 г. 45 х. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка“ — 2 праграмы 1. Вечар памылак (камэдыя) 2. Зладзеі (драма). Пачатак а 7 гадз. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура“ — Амэрыканская камэдыя **Хрызантэма**. Звыш праграмы—Буксы пылаюць. Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ — М. Ю. Лермантаў на экране **Герой нашага часу**. Звыш праграмы—Дакументы вякоў. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ — Замежны фільм **На сёмым небе** (Гарольд Лейд). Палітасьветфільм Тапаграфічная карта—у 3 частках. Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту **1 р.**

КОЖНЫ кандыдат і член савету, **КОЖНЫ** саўгас, калгас, **КОЖНЫ**

АСЬВЕТНІК ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАДПІСЧЫКАМ І АКТЫЎНЫМ РАСПАЎСЮДЖВАЛЬНІКАМ ГАЗЭТЫ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

ОРГАНУ ЦВК і СНК БССР

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА НА ПОШЦЕ

БЕЛДЗЯРЖСНАБ

паведамляе, што з 1 ліпеня 1931 г.

АДЧЫНЯЕЦЦА

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛДЗЯРЖСНАБУ

па Школьнай вул., д. № 4

(кантакарэнт у Дзяржбанку № 51-69).

Усе спажыўцы Меншчыны і Барысаўшчыны, якія да гэтага часу снабжаліся Праўленьнем Белдзяржснабу у Менску, з 1-VII г. г. будуць снабжацца непасрэдна МЕНСКІМ АДДЗЯЛЕНЬНЕМ.

3—3 БЕЛДЗЯРЖСНАБ.

БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВАМ АДЧЫНЕНА **НІКЕЛІРОВАЧНАЯ МАЙСТЭРНЯ** з бляшаным цэхам (Гандзёвая, 48, у двары) для абслугоўваньня лекавых і аптэчных устаноў (нікеліроўка, вастрэньне, палуда, рамонт прымусаў і іншых бляшаных работ).

Па магчымасьці майстэрняй будуць прымацца заказы і ад іншых устаноў і прадпрыемстваў. 3-5

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 22-II 1931 г. па арт. 196 з санк. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Скуратоўскага сельсавету Данілаву Антону за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 19-II 1931 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дырэктару саўгасу Цяцерына Антончыку Тодару Т. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выд